ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарожным дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасля тэксту—50 к. Іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. „ледзьгу".

Москва, Б-ко ВСНХ СССР
Выд. студ. сьпст

ЭЬЪЯЗДЗЕ

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Навны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

СУБОТА, 25 кастрычніка 1930 г.
№ 250 (3848)
Год выданьня — XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

ЗА ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ

Праграма ўдарнага кварталу, які аддзяляе нас ад трэцяга году пяцігодкі, мае вялізарнае гаспадарчае і палітычнае значэньне.

Апрача таго, што на працягу асобнага трохмесячніка прамысловасьць павінна поўнасьцю **пакрыць запазычанасьць** другога году пяцігодкі, **сам па сабе** прамфінплян ударнага кварталу па сваіх тэмпах і аб'ёмах адыгрывае вялікую ролю ў выкананьні пяцігодкі за чатыры гады.

Разам з тым, ударны квартал павінен падрыхтаваць яшчэ больш высокія тэмпы для трэцяга году пяцігодкі.

Зусім відавочна, што выкананьне ўсіх гэтых адказьнейшых задач магчыма толькі пры поўным намаганьні сіл усяе партыі, усіх арганізацый рабочае клясы. Толькі шляхам бязьлітаснай барацьбы з правымі і «левымі» апартуністымі, якія часта на словах прызнаюць лінію партыі, а на справе супраціўляюцца яе правядзеньню, толькі пры мабілізацыі найшырэйшых мас рабочае клясы магчыма перамаганьне маючыхся ў нас труднасьцяй, выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

У барацьбе за тэмпы ўдарнага кварталу набывае значэньне першачарговай важнасьці **павышэньне адказнасьці партыйных ячэек за кіраўніцтва ўсімі галінамі вытворчага жыцьця фабрык і заводаў.**

Партарганізацыі дабіліся ў гэтым вялікіх посьпехаў. Аднак, прыходзіцца канстатаваць, што рад парт'ячэек яшчэ стаіць у баку ад вытворчых задач, не заняла свайго месца ў справе барацьбы за прамфінплян. Ёсьць факты яўна апартуністычнай бязьдзейнасьці, а часам і простага супраціўленьня ўзятым тэмпам.

У гэтай сувязі вельмі паказальны факты, якія падаваліся гэтымі днямі ў «Зьвязьдзе». Так, нават па Менску, яшчэ ёсьць асобныя ячэйкі, якія зусім не абмяркоўвалі верасьнёўскай адозвы ЦК УсеКП(б). Кіраўніцтва Скурсындыкату, замест адшуканьня сродкаў да папаўненьня сваёй сыравінай базы, на абутковай фабрыцы дало праваапартуністычны лёзунг скарачэньня сустрэчнага прамфінпляну. На Віцебскім чыгуначным вузле ёсьць сур'ёзныя прарывы, між тым, палова партарганізацыі зусім ня ўдзельнічае ў сацыялістычным і ўдарніцтве. Праўленьням праваапартуністычнай практыкі з боку паасобных членаў партыі тут не давалася патрэбнага адпору. У парт'ячэйцы Бабруйскай друкарні «партыец» Лазараў, замест барацьбы з рвацкімі настроямі, прапаведуе такую «тэорыю»: «Пры ўстаноўленьні распэнак раўняцца на цэны прыватнага рынку».

З усімі падобнымі праяўленьнямі праваапартуністычнай практыкі і хвасьцізму патрэбна самая рашучая, бязьлітасная барацьба. Трэба дабіцца такога становішча, каб **кожная ячэйка, кожны камуніст і камсамолец на справе адказваў за выкананьне прамфінпляну, стаяў у радох перадавых барацьбітоў за ажыцьцяўленьне баявых задач свайго прадпрыемства.**

Адной з асноўных умоў, якія забясьпечваюць выкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу, зьяўляецца сапраўдная перабудова прафработы, у адпаведнасьці з задачамі, што вынікаюць з пастаноў XVI партзьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б.

Буйнейшыя правалы ў рабоце кіраўніцтва ЦСПСБ, бялумоўна, адбіліся на ўсёй прафработе.

Працоўны ўздым рабочых мас далёка не заўсёды і ня ўсюды быў па-баявому падхоплен прафсаюзнымі органамі. Новыя формы ўдарніцтва (вытворчыя манэўры, «сквозные» брыгады, сустрэчны прамфінплян і інш.) яшчэ ня ўсюды прасяклі на нашых фабрыках і заводах. Ва ўсесаюзны конкурс на лепшае прадпрыемства, які мае вялізарнае палітычнае значэньне ў справе барацьбы за прамфінплян, ня ўключыліся яшчэ многія прадпрыемствы.

Зараз, побач з патрэбнасьцю абнавіць і ўмацаваць кіраўніцтва ЦСПСБ, наўстае задача **рашучага ажыўленьня ўсёй прафработы, паляпшэньня кіраўніцтва ўзрастаючай актыўнасьці мас, узмацненьня прафсаюзных кадраў лепшымі ўдарнікамі.** Трэба проста сказаць, што посьпех выкананьня прамфінпляну ўдарнага кварталу будзе залежыць у вялікай ступені ад таго, наколькі нашы прафорганы змогуць перабудаваць сваю работу, наколькі яны будуць здольнымі спраўляцца з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду.

Нельга не адзначыць, што ня гледзячы на ўсю важнасьць, якую мае выкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу, **на паасобных прадпрыемствах мы маем недапушчальнае паслабленьне тэмпаў работы.** Паасобныя трыкутнікі супакоеныя выкананьнем пляну другога году, паслабілі сваю пільнасьць, дапусьцілі прымірэнцкія адносіны да зьніжэньня тэмпаў і, дзякуючы гэтаму, сталі перад фактам паслабленьня працоўнай дысцыпліны і невыкананьня заданьняў па першых-жа пяцідневках ударнага кварталу. Такія факты назіраліся на гомельскай швейнай фабрыцы «Каміптэрн», якая скончыла пляны другога году з перавышэньнем, на абутковай фабрыцы «Праца». Зьніжэньне тэмпаў мела месца і на «Чырвонай бярозіне», «Пралетарскай перамозе» ды іншых прадпрыемствах.

Падобнага роду зьявішчы павінны разглядацца, як праяўленьне праваапартуністычнай бязьдзейнасьці і самацёку і спаткаць самы суровы адпор з боку ўсяе пралетарскае грамадзянасьці.

Ва ўдарным квартале трэба ня толькі замацаваць тэмпы, дасягнутыя пасьля адозвы ЦК УсеКП(б), але ўсямерна ўзмацніць іх, узьняць хвалю актыўнасьці мас на новую вышыню.

Сярод практычных задач, зьвязаных з выкананьнем прамфінпляну ўдарнага кварталу, трэба паставіць, як важнейшую карэнную праблему— **павышэньне якасных паказальнікаў,** у тым ліку карэннае паляпшэньне якасьці прадукцыі, што ідзе для шырокага рабочага спажыўня.

Іменна з боку якасных паказальнікаў найбольш няспрыяюча стаяла справа ў **результатах выкананьня пляну другога году пяцігодкі.** Па рэспубліканскай прамысловасьці за 11 месяцаў мінулага гаспадарчага году, сабекошт зьніжаны ўсяго на 7,7 проц., замест 11 проц. паводле пляну. Сярод прадпрыемстваў, плянаваных ВСНГБ, 43 ня выканалі якасных паказальнікаў.

З усёй вастратой наўстае нытаньне аб **якасьці прадукцыі.** Сюды трэба перш за ўсё накіраваць увагу партыйных і прафсаюзных арганізацый.

Трэба ўсямерна заахвочваць і папярэдзіць стварэньне **брыгад па праверцы якасьці, арганізацыю брыгад узорнай прадукцыі.** На службу павышэньня якасьці прадукцыі і зьніжэньня сабекошту трэба паставіць новую форму барацьбы за прамфінплян,— **вытворчыя манэўры,** выяўляючы праз іх унутраныя рэсурсы прадпрыемства, магчымасьці рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, зьмяншэньня браку і г. д.

Пытаньне якасьці непарыўна зьвязана з тэмпамі ўсяго нашага гаспадарчага развіцьця і паляпшэньня матар'яльна-бытавога становішча рабочае клясы. Трэба абвясьціць вайну падмене зьніжэньня сабекошту пагаршэньнем якасьці прадукцыі. Ударны квартал павінен **стаць пераломным** кварталам як у галіне якасьці прадукцыі, так і ў галіне зьніжэньня сабекошту.

Вынікі другога году пяцігодкі з усёй відавочнасьцю пацьвярджаюць правільнасьць генэральнай лініі партыі, рэальнасьць вызначаных тэмпаў нашага разьвіцьця. Наперакор малаверам з правага лягеру, мінулы гаспадарчы год па ўсёй народнай гаспадарцы БССР даў значны рост; прычым, ня гледзячы на тое, што на паасобных вучастках, асабліва ў галіне якасных паказальнікаў, мы маем недавыкананьне—амаль па ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва мы дасягнулі неравышэньня адведных меркаваньняў пяцігадовага пляну.

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам КП(б)Б і яе ЦК мы ўпэўнена пойдзем да новых перамог па шляху будаўніцтва сацыялізму. Даючы рашучы адпор правым і «левым» апартуністым, мабілізуючы найшырэйшыя пласты рабочае клясы вакол барацьбы за генэральную лінію партыі, арганізуючы творчую ініцыятыву мас, мы поўнасьцю выканаем заданьні ўдарнага кварталу і падрыхтуем гэтым усе неабходныя ўмовы для пасьпяховага выкананьня плянаў трэцяга, **рашаючага** году пяцігодкі.

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

ад 19 кастрычніка 1930 году

ПА ІНФАРМАЦЫІ САКРАТАРОЎ РАЁННЫХ КАМІТЭТАЎ І СТАРШЫНЬ РВК ТУРАЎСКАГА, ГРЭСКАГА, ЖЫТКАВІЦКАГА, КОХАНАЎСКАГА, КРУПСКАГА, ЧЭРВЕНЬСКАГА І ГАРАДОЦКАГА РАЁНАЎ АБ ХОДЗЕ АСЕНЬНЯ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ.

1. Адзначыць, што з боку гэтых раёнаў дырэктывы партыі аб выкананьні плянаў засеву ў жыцьцё не праведзены.

2. За невыкананьне дырэктыў партыі па пасеве і скарачэньні плянаў пасеву, даных Наркамземам, бюро Жыткавіцкага, Коханаўскага і Грэскага раёнаў КП(б)Б абвясьціць вымову з апублікаваньнем у друку.

3. Прыняць да ведама заявы сакратароў Тураўскага і Крупскага раённых камітэтаў КП(б)Б, што плян, запрапанаваны Наркамземам цалкам імі прыняты і выконваецца.

4. Справа аб невыкананьні Гарадоцкім райкомам КП(б)Б заданьня ЦК па сяўбе перадаць у ЦКК КП(б)Б. Прасіць прэзыдыум ЦККК разглядзець гэту справу і ўнесьці прапанову ў ЦК.

5. Запрапанаваць усім раённым камітэтам КП(б)Б ужыць самыя рашучыя меры да хутчэйшага сканчэньня асеньняй пасеўнай кампаніі і поўнага выкананьня плянаў, прынятых ЦК.

Падпальшчыкі вайны за работай

Лёкаі Францыі забараняюць увоз з СССР

РЫМСКІ ПАПА БЛАГАСЛАЎЛЯЕ „АНТЫДЭМПІНГАВЫ" ПАХОД

ПА ЎКАЗЫ ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 21. Бельгійскі ўрад пастанавіў падрыхтаваць на подпіс каралю дэкрэт, накіраваны супроць савецкага экспарту. **Дэкрэт устанаўляе спэцыяльныя дазволы на ўвоз, а таксама на транзіт ненаторых тавараў, якія вытвараюцца, або прыбываюць з Савецкага Саюзу.** Разам з тым, паводле вестак друку, урад пастанавіў **скасаваць абмежаваньні на ўвоз францускай пшаніцы.**

РУМЫНСКІЯ ФАШЫСТЫЯ НЕ АДСТАЮЦЬ

ВЕНА, 21. Румынскае міністэрства фінансаў апублікавала загад, **які канчаткова забараняе ўвоз у Румынію савецкіх тавараў.** Усе выданыя да гэтага часу дазволы сапраўдны толькі для ўвозу савецкіх тавараў, якія знаходзяліся на румынскай тэрыторыі да 15-га кастрычніка.

РЫМСКІ ПАПА ЗНОЎ НА АРЭНЕ

РЫМ, 21. Орган папы **«Асэрваторэ Романо»** вядзе шалёную антысавецкую кампанію. Газэта штодзённа друкуе ўсякія выдумкі, прабуючы давесьці, што СССР «ажыцьцяўляе дэмпінг, даход ад якога ідзе на рэвалюцыйную прапаганду». Папскі орган заклікае **«ў імя бога» спыніць эканамічныя зносіны з Савецкім Саюзам.**

«Мерапрыемствы паасобных краін невыстарчальны, — піша газэта, — набходны энэргічныя дзеяньні і згода вялікай колькасьці краін. Барацьба ня церпіць адтэрмінаваньня, бо небясьпека расьце з кожным днём».

ФІНЛЯНДЗКАЯ МОСЬКА РАЗЫШЛАСЯ

ГЭЛЬСІНГФОРС, 23. Кампанія супроць савецкага экспарту ў Фінляндыі працягваецца. Газэты паранейшаму амаль штодзённа друкуюць артыкулы з выдумкамі і паклёпам супроць СССР. У Выбургу сход гандлёвага таварыства «Сампо» прыняў пастанову, у якой **раіць членам таварыства «байкатаваць тавары, якія ўвозяцца з СССР».** (ТАСС).

АНТЫСАВЕЦКАЯ КАМПАНІЯ Ў ЧЭХА-СЛАВАКІІ

ПРАГА, 21. За апошнія дні прыкметна павысілася актыўнасьць антысавецкіх колаў Чэха-Славакіі. Гэта павышаная актыўнасьць стаіць у простай сувязі з **наведваньнем Чэха-Славакіі францускім міністрам гандлю Фландэнам** — аўтарам закону супроць савецкага экспарту ў Францыі, які зараз падарожнічае па краінах Усходняй Эўропы з мэтаю арганізаваць іх у эканамічны і палітычны антысавецкі блёк. Асабліва пырока разгортваецца кампанія супроць так званага **«савецкага дэмпінгу».** Антысавецкая кампанія ў Чэха-Славакіі не абмяжоўваецца аднак, барацьбой супроць савецкага экспарту. Чэха-славацкі ваенны міністар Вішкоўскі, выступаючы ў ваеннай камісіі парляманту ў абарону бюджэту ваеннага міністэрства, паміж іншым, заявіў: «Зьнешнепалітычнае становішча не дае магчымасьці нам замяніць ваенную абарону «дагаварамі». Вішкоўскі апраўдвае ўзмацненьне ўзбраеньняў Чэха-Славакіі тым, што Чэха-Славакіі пагражае «ваенная небясьпека» з боку Вэнгрыі і... СССР.

МІЛЬЯРДЫ—НА ЎЗБРАЕНЬНЕ

ПРАГА, 22. У бюджэтнай камісіі парляманту, у сваім дакладзе аб узбраеньнях Чэха-Славакіі, ваенны міністар Вішкоўскі патрабаваў **павялічэньня ваеннага бюджэту.** Вішкоўскі заявіў, што адпушчаныя па ваенным патрэбы 1 мільярд 400 млн. крон (адна чэхская крона — 6 кап.) зусім невыстарчальны і што міністэрству даводзіцца ўрэзваць свой бюджэт па многіх артыкулах. Гэта, аднак, **не датычыць, паводле слоў Вішкоўскага, паветранага флёту, на які міністэрства ў 1931 годзе адпускае 30 млн.** Далей Вішкоўскі заявіў, што міністэрства стварае спэцыяльны авіяцыйны фонд, у які будуць прыцягвацца і прыватныя сродкі.

МІЖНАРОДНАМУ „КАМІВАЯЖЭРУ" НЕ ШАНЦУЕ

Правал чарговай антысавецкай аграрнай канфэрэнцыі ў Бухарэсьце

ВЕНА, 22. Як падаюць з Бухарэсту, заключаны пратакол «аграрнай канфэрэнцыі» сьведчыць аб дарэмных стараньнях скрыць раскол, які пачаўся сярод яе ўдзельнікаў. Канфэрэнцыя выказалася за ўзьвышэньне прывілеяваных лімітаў у адносінах да экспарту эўрапейскіх аграрных прадуктаў на эўрапейскія рынкі і за вывучэньне крыцыпу найбольшага спрыяньня для іх праблемы прывілеяваных лімітаў. Дэлегаты **Румыніі, Польшчы, Вэнгрыі і Югаславіі,** пад націскам катастрафічнага становішча сялянства, выказаліся за патрэбнасьць хутчэйшага стварэньня аграрнага блёку і **выступілі супроць прынцыпу найбольшага спрыяньня.** Удзельнікі канфэрэнцыі разыйшліся і па нытаньні аб фактычных вынніках стварэньня аграрнага блёку. Так, напрыклад, Вэнгрыя, схільна супрацоўнічаць з іншымі краінамі па экспарту хлеба пры ўмове бязмуоўнага палітычнага і эканамічнага недапушчэньня ў гэты блёк Чэха-Славакіі (ТАСС).

Прадвыбарчы тэрор у фашысцкай Польшчы

Фашысцкая арытмэтыка

Польскі фашызм для таго, каб скрыць сваё катастрафічнае гаспадарчае становішча і атрымаць заграніччыя крэдыты для ўзмацненьня тэмпаў падрыхтоўкі вайны супроць СССР, ня спыняецца ні перад чым, нават перад фальшаваньнямі свайго бюджэту, прыбыткаў і г. д. У «Зьвязьдзе» мы ўжо падавалі факты фальшаваньня прыбыткаў міністэрства пошты, калі замест некалькі сот тысяч дэфіцыту было запрыходавана 7 млн. прыбытку ад пошты.

Зараз «Газэта Варшаўска» ў № 301 ад 17 кастрычніка падае пра **фальшаваньне фашысцкімі заправіламі хлебнага экспарту** Польшчы за мінулы год. Усім вядома, што зямляробства ў фашысцкай Польшчы перажывае зараз цяжкі крызіс. Афіцыёз-жа «Газэта Польска» ў № ад 14 кастрычніка ў артыкуле пана **Допэнгі** пад загалоўкам «Польшча — сьвятовы экспарцёр збожжа» піша, што ў бягучым годзе — годзе катастрафічнага гаспадарчага крызісу — Польшчаю больш вывезена збожжа, чым у 25-26 г. — адным з найбольш спрыяючых для Польшчы гадоў экспарту збожжа. Як гэта магло здарыцца?

А вось эндэцкая газэта выкрывае гэты сакрэт фашысцкіх заправы. У «Газэце Польскай» была зьмешчана табліца надвышкі экспарту збожжа ў Польшчы ў 25-26 г. і 29-30 г. над імпартам. Паводле гэтай табліцы ў 1925-26 г. надвышка вывазу пшаніцы складала 123,1 тыс. тон, а ў 1929-30 годзе — 8,8 тыс. тон, жыта ў адпаведныя гады 342 тыс. тон і 330, тон, ячменю—168,4 і 262,7, аўса імпартавана ў 1925-26 г. 88,4 тыс. тон і ў 1929-30 годзе — 78,8 тыс. тон.

Паводле каментараў «Газэты Польскай», вынікае, што ў той час, як у 25-26 г. — самым спрыяючым годзе для экспарту польскага збожжа надвышка прывозу над вывазам 4 галоўных відаў збожжа выносіла 545,1 тыс. тон, дык у 29-30 годзе—**680,4 тоны, або на 135,3 тыс. тон больш.**

З гэтай табліцы відаць таксама, што калі Польшча вывозіла яшаніцу, жыта і ячмень, дык увесь час яна прывозіла авёс. У 1925-26 г. надвышка імпарту аўса складала 88,4 тыс. тон, а ў 29-30 г. 78,8 тыс. тон. Што ж робіць фашысцкі статыстык, каб паказаць павялічэньне экспарту збожжа ў 29-30 г., а значыць і паляпшэньне гаспадарчага становішча краю? Ен ад агульнай колькасьці экспарту збожжа 1925-26 г. адымае імпарт аўса і атрымлівае суму ў 545,1 тыс. тон, у 1929-30 г. ён да лічбы экспарту пшаніцы, жыта і ячменю дадае імпарт аўса, таму замест зьмяншэньня экспарту збожжа ў 1929-30 г. у параўнаньні з 25-26 г. на 22,3 тыс. тон атрымлівацца павялічэньне экспарту на 135,3 тыс. тон.

Ну, чым ня «цуда»? Сапраўды фашысцкая Польшча зьяўляецца краем «цудаў».

Галадоўка палітвязьняў у Бжэзянах

Як падае орган польскіх сацыял-фашыстых «РОБОТНІК», 15 кастрычніка палітвязьні ў Бжэзянскай турме пачалі галадоўку. ГАЛАДУЕ 141 ЧАЛАВЕК. Палітвязьні дамагаюцца прысьпяшэньня сьледзтва, якое цягнецца ўжо другі год, звальненьня тых палітвязьняў, сьледзтва якіх ужо скончана і супроць якіх няма ніякіх канкрэтных доводаў іх віны, а таксама супроць барбарскіх абыходжаньняў турэмнай адміністрацыі.

АРЫШТ УДЗЕЛЬНІКАЎ РАБОЧАГА СХОДУ

Як падае эндэцкі «Дзеньнік Віленскі», у лесе, недалёка в. М. - Варавічанка, каля Шэпэтоўшчыны, арыштаваны нелегальны сход нібыта камуністых. Усяго арыштавана 6 асоб, на чале з **М. Ягоравай.** Газэта паведамляе таксама, што ў арыштаваных нібыта канфіскавана малая друкарская машына для друкаваньня адозваў.

Дэманстрацыі пратэсту супроць аануляваньня левых сьпісканў

Аануляваньне галоўнай выбарчай камісіяй пры актыўным падтрыманьні «Цэнтралеву» усіх левых выбарчых сьпісканў выклікала вялікае абурэньне пралетарыяту горада Варшавы. За апошнія дні ў розных канцох гораду адбыліся вулічныя дэманстрацыі - пратэсту супроць забароны левых рабочых сьпісканў, а таксама супроць прадвыбарчага фашысцкага тэрору. Так, «Газэта Польска» падае аб магутнай рабочай дэманстрацыі, якая адбылася ў Варшаве 20 кастрычніка. На скверы ля пляцу Старынкевіча сабралася некалькі сот рабочых. Стройнымі радамі, з чырвоным сьцягам і пяньнем «Інтэрнацыяналу» дэманстранты накіраваліся са скверу на вуліцы Навагрудзкай у напрамку да вуліцы Тарчынскага, дзе знаходзіцца галоўная выбарчая камісія. Значны атрад паліцыі на аўтамабілях перагарадзіў дарогу дэманстрантам. **У ход былі пушчаны гумовыя палкі і прыклады.** Дэманстрацыя была разагнана, некалькі чалавек арыштавана.

Па Савецкім Саюзе

Хваля прыліву ў калгасы

МАСКВА. 25 кастрычніка канчаецца дэкада калектывізацыі 1 ураджаю. Папярэднія даныя сьведчаць аб бесьпярэчным узмацненьні прыцёку адзіначасобнікаў у існуючыя калгасы, а таксама аб арганізацыі новых калгасаў. Сярод адзіначасобнікаў разгорнута вялікая работа па папулярызацыі дасягненьняў калгасаў. У рэзультаце гэтае работы працэс калектывізацыі разгортваецца ўсё шырэй і глыбей. **Па Шацкім раёне** (Сярэдняя Волга) процант калектывізацыі за адзін тыдзень **павялічыўся з 37 да 54. У Сарочынскім раёне** (Ніжняя Волга) за дзесяць дзён уступіла ў калгасы **1510 гаспадарак. У Сярэдня-Вольскім краі** за дзесяцідзенны тэрмін процант калектывізаваных гаспадарак павялічыўся **з 24 да 30. У Ніжня-Вольскім краі** за апошнія дні калектывізавана звыш **20.000 гаспадарак.**

На Паўночным Каўказе за апошнія 20 дзён уступіла ў калгасы звыш 20.000 гаспадарак. Многія калгасы прыдумалі новыя формы ўцягненьня адзіначасобнікаў. У Сярэдня-Волжскім краі рад калгасаў арганізаваў брыгаду «чырвоных сватоў», якія ставяць перад сабой задачу знаёміць адзіначасобнікаў з калгасам, са статутам сельска-гаспадарчых арцеляў і аформіць уступленьне ў калгасы. У выніку работ «чырвоных сватоў» у калгас «Путь к социализму» вярнулася 320 выхадцаў.

Аднак, далёка ня ўсюды партыйныя і грамадзкія арганізацыі здолелі арганізаваць прыліў адзіначасобнікаў у калгасы і стаць на чале яго. Адзначаюцца ў гэтых адносінах простыя скажэньні існуючых дырэктыў. У Абдулінскім раёне (Сярэдняя Волга) райкалгасасяо пастанавіў не дапускаць арганізацыю калгасаў менш 40 двароў. У Горскім раёне быў складзены і апублікаваны плян па кожным пасёлішчы, дзе вызначан процант калектывізацыі на зіму.

Дэкада калектывізацыі і ўраджаю заканчваецца, але работа па арганізацыі шырокага прыліву адзіначасобнікаў у калгасы толькі пачалася. Задача зводзіцца да таго, каб выкарыстаць гаспадарчыя посьпехі калгасаў і настрої бядняцка - серадняцкіх мас для ўзмацненьня гэтага прыліву, для далейшага росту старых калгасаў і шырокай арганізацыі новых.

НОВЫЯ КРЫНІЦЫ ЁДУ

МАХАЧКАЛА. Ва ўрочышчы Бэрыкей са сьвідравальнай шчыліны, закладзенай для пошукаў нафты, пачаў біць магутны фантан гарачае вады. Вада хутка адкладвала пьвёрдую скарынку каля жарла шчыліны. Аналіз вады даўеў, што ў адным не літры ёсьць 17 міліграмаў ёду. Паводле прыблізных падлікаў са шчыліны штодзённа можна будзе атрымоўваць каля 250 тон ёду.

ЦІКАВАЕ ВЫНАХОДНІЦТВА САВЕЦКАГА ВУЧОНАГА

ЛЕНІНГРАД, 23. На пасяджэньні фізыка - матэматычнага аддзелу акадэміі навук акадэмік **Лазараў** паведаміў, што ў яго лябараторыі ўдалося атрымаць цукар шляхам складаных хімічных працэсаў над сумесьсю кіслаты і вады.

ПАБУДОВА МАГУТНАГА СЕРКАВУГЛЯРОДНАГА ЗАВОДУ

ЛЕНІНГРАД. На тэрыторыі Охпэнскага заводу закончана пабудова магутнага серкавуглярроднага заводу. Новы завод будзе абслугоўваць гуманую, а таксама і скураную прамысловасьць. На першы час завод будзе даваць і тыс. тон у год. Пуск заводу прыстасоўваецца да кастрычніцкіх урачыстасьцяй. (ТАСС).

КАШТОЎНАЕ ПАЧЫНАНЬНЕ

ЛЕНІНГРАД. Ініцыятыўная група рабочых заводу «Красная Заря» правяла ў жыцьцё каштоўнае пачынаньне: пры заводзе створана «т-ва прыцэлаў дзяржпрэдыту». Т-ва мае ўжо на 40.000 рублёў поўнасьцю аплачаных аблігацый 3-й пазыкі і падпісалася на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» на 70.000 руб.

ПЕРШЫ ВОПЫТ НЯ ТОЛЬКІ Ў СССР, АЛЕ І Ў ЭЎРОПЕ

ПАБУДОВА 6-ПАВЯРХОВАГА ВОПЫТНА - ПАКАЗАЛЬНАГА ДОМУ Ў МАСКВЕ

МАСКВА, 23. Усесаюзнае т-ва рацыяналізатараў будаўнікоў пры НК РСІ СССР зараз будуе 6-паверховы вопытна-паказальны дом аб'ёмам у 16 з пал. тысяч куб. мэтраў. Дом будуецца ў Маскве, па заданьні «Мосстроя». **Усе частні вопытна - паказальнага дому загатаўляюцца на заводах, а на месцы будоўлі робіцца толькі мантаж пры дапамозе кранаў і іншых прылад.** Сабекошт будаўніцтва будзе ня вышэй звычайнага будаўніцтва. Рад інжынераў, што вярнуліся з заграніцы, заявілі, што **пабудова 6-паверховага вопытна-паказальнага дому зьяўляецца першым вопытам падобнага роду ня толькі ў СССР, але і ў Эўропе.** Да гэтага часу абгрэвы дамы булаваліся ня вышэй аднаго-двух паверхаў.

Праваапартуністых — вон з радоў партыі

Выключэньне Сьляпкова з партыі

У Самары адбыўся сход вузаўцаў, на якім выступіў вядомы правы апазыцыянэр Сьляпкоў.

Сьляпкоў сказаў вялікую прамову, у якой ён усяляк апраўдваў Бухарына і адхіляў сувязь кандрацьёўцаў-громанаўцаў з правай апазыцыяй.

Усіх прамоўцаў, якія выступалі супроць яго, за генэральную лінію партыі Сьляпкоў называў «сапляками».

Бюро ячэйкі пастанавіла ВЫКЛЮЧЫЦЬ СЬЛЯПКОВА З ПАРТЫІ.

Бэрлінскія мэталістыя трымаюцца стойка

СТАН АБЛОГІ Ў РУРСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ

Рабочыя масамі пакідаюць рады сацыял-здраднікаў

Стан аблогі ў Рурскай вобласьці

БЭРЛІН, 23. Пасьля забароны «галоднага паходу» беспрацоўных у Дортмунд, цяпер забаронены і ўсе іншыя «галодныя паходы». У Рурскай вобласьці паліцэйскай управай абвешчан стан аблогі.

Актыўнасьць забастоўшчыкаў расьце

БЭРЛІН, 23. Побач з агульнымі патрабаваньнямі рэвалюцыйнай прафапазыцыі, рабочыя паасобных прадпрыемстваў высоўваюць сваю праграму барацьбы. Патрабаваньні абмяркоўваюцца на сходах бастуючых і пасьля прыняцьця падаюцца праз стачачныя камітэты адміністрацыі заводаў. Рабочыя «Норд Дойчэ Кабель Вэрхэ» выставілі наступныя патрабаваньні: адмова прадпрыемцаў ад зьніжэньня зарплаты, устанаўленьне 40-гадзіннага рабочага тыдню, параўнаньне зарплаты рабочых і работніц, уключэньне ў абвешчаныя гадзіны часу для мыцьця, адмена дадаткаў, штрафаў за «добрыя ці кепскія паводзіны». Падобныя патрабаваньні высоўваюцца рабочымі іншых заводаў.

Разгон рабочай дэманстрацыі ў Гамбургу

БЭРЛІН, 22. Як падаюць з Гамбурга, на беспрацоўных, якія заняты на прымусовых грамадзкіх работах і сабраліся на дэманстрацыю ў абарону сваіх патрабаваньняў, а таксама ў знак салідарнасьці з бастуючымі бэрлінскімі мэталістымі, перад будынкам кіраўніцтва грамадзкага нагляду,—напала паліцыя з гумовымі палкамі. Аднак, дэманстранты узяўшы настройліся ў рады і накіраваліся ўперад. Тады паліцыя зноў накінулася на дэманстрантаў, прытым адзін з паліцэйскіх выхапіў рэвальвэр і пачаў страляніну. Паліцыя зрабіла шматлікія арышты дэманстрантаў. (ТАСС)

Рады рэвалюцыйнай прафапазыцыі павялічваюцца

БЭРЛІН, 23. Прыліў рабочых у рэвалюцыйную прафапазыцыю павялічваецца са дня на дзень. З 2.300 рабочых, занятых на адным з бэрлінскіх прадпрыемстваў (уссагульная электрычная кампанія) — 1.400 ужо зарэгістраваны ў прафапазыцыі, 250 з іх прынятыя зноў. На заводзе электрычнае прамысловасьці «Отрам Вэрхэ» зарэгістравана 400, зноў прынята 350 рабочых. На заводзе трансфарматараў «Аэг» зарэгістравана 500, зноў прынята 400. Скліканы на заводзе «Цэлетунхэн» рэфармісцкім прафсаюзам мэталістых сход рабочых прайтоў пад кіраўніцтвам прадстаўніка рэвалюцыйнай прафапазыцыі. Сход бастуючых на заводзе «Носінг Вэрхэ» вывеў са складу стачачнага камітэту трох рэфармістых і ўвёў у яго пяць рэвалюцыйных рабочых. У прынятай рэзалюцыі сход заяўляе, што адзіным кіраўніком стачкі ён прызнае рэвалюцыйную прафапазыцыю. У прафапазыцыю зноў уступіла 150 рабочых. Скліканы рэфармісцкім прафсаюзам сход рабочых заводу «Арон» выказаўся за перадачу кіраўніцтва забастоўкай рэвалюцыйнай прафапазыцыі і выказаў недавер'е нямецкай сацыял - дэмакратычнай партыі. На гэтым заводзе да рэвалюцыйнай прафапазыцыі далучыліся 366 рабочых.

Савецка-нямецкі гандаль

БЭРЛІН, 24. Апублікаваны выніковыя даныя аб гандлі паміж СССР і Нямеччынай. Паводле гэтых даных аварот гандлёвых арганізацый СССР і Нямеччыны дасягнуў **501,3 млн. руб.**— на 7,1 проц. больш чым у мінулым годзе. З гэтае сумы на долю закупак у Нямеччыне прыпадае 229,3 млн. рублёў — на 34 млн. **або 17,4 проц. больш, чым у мінулым годзе.** Прадана-ж у Нямеччыну тавараў на 272 млн. рублёў, або на 1,8 млн. рублёў больш чым у мінулым годзе. 67,5 проц. усіх савецкіх закупак прыпадае на машыны і абсталяваньне.

Крывавая расправа над працоўнымі Зах. Беларусі

ДАЛЕЙШЫ ПАГРОМ КУЛЬТАСЬВЕТНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Баявая салідарнасьць пралетараў Вільні з арыштаванымі

Ліквідацыя беларускіх культурна-асьветных арганізацый працягваецца Пасьля разгрому цэнтральнага праўленьня ТБШ і беларускага банку ў Вільні фашысцкая ўлада прыступіла да ліквідацыі гурткоў ТБШ на абшарах Віленскага і Навагрудзкага ваяводзтваў. Масавыя арышты членаў і дзеячоў гэтай культурна-асьветнай беларускай арганізацыі адбываюцца ў паветах ДЗІСЬНЕНСКІМ, ПАСТАЎСКІМ, ВІЛЕЙСКІМ, МАЛАДЗЧАНСКІМ І БАРАНАВІЦКІМ. Гэтымі днямі ў Вільні арыштаваны ДОКТАР МАРЦІНЧЫК, кандыдэтура якога высунута ад беларускага рабоча-сялянскага блёку «Змаганьне» на паслы ў польскі сойм, а таксама арыштаваны гр. БУЙКО.

Арыштавана такая маса людзей, што нават цэнтральны арышт у Вільні ня мог зьмясьціць усіх зьявяленых і пракуратура прымушана была частку палітвязьняў перавесьці ў Лукіскую турму. 20 кастрычніка, калі частка арыштаваных была выведзена з цэнтральнага арышту на вуліцу для перавозкі ў Лукішкі, рабочыя Вільні, як падае эндэцкі «Дзеньнік Віленскі» ў № 243, нападзілі авацыю і магутную дэманстрацыю салідарнасьці з арыштаванымі барацьбітамі за лепшую будучыню працоўных мас. Рабочыя сустрэлі палітвязьняў пяньнем «Інтэрнацыяналу».

Ня гледзячы на тое, што ў ход былі пушчаны гумовыя палкі і прыклады, паліцыя, якая знаходзілася пры турме, не магла разагнаць дэманстрантаў. Толькі падасьпеўшым новым атрадам конной паліцыі дэманстрацыя была разагнана. Перад Лукіскай турмой рабочымі была арганізавана новая дэманстрацыя, якая таксама была разагнана паліцыяй. Некалькі чалавек арыштавана.

Удар ворагаў будзе адбіты

ГУТАРКА З НАМЕСЬНІКАМ НАРКОМА ШЛЯХОЎ ЗНОСІН ТАВ. В. І. ЗОЧ

**Цьвёрдая лінія на індустрыялізацыю Савецкага Саюзу

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Праз дэлегацкія сходы падрыхтуем актыўных барацьбітоў за сацыялізм

Стаць на чале ўзросшай актыўнасьці работніц, калгасьніц, бяднячак і середнячак сялянак, па-баявому перабудаваць работу на дэлегацкіх пунктах

Чашніцкія кіраўнікі ігнаруюць жанработу, зрываюць важнейшую палітычна-масавую кампанію

Забясьпечыць пералом

Справаздачна-перавыбарчая кампанія дэлегацкіх сходаў не заняла належнага месца ў рабоце раду партыйных арганізацый. Гэта масавая, палітычная кампанія не выкарыстоўваецца ў максымальнай меры для мабілізацыі шырокіх мас работніц і працоўных жанчын вёскі на выкананьне галоўнейшых мерапрыемстваў партыі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва і пасьпяховага правядзеньня бягучых гаспадарча-палітычных кампаній.

Работа па разгортваньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў ня была ўвязана радам мясцовых партарганізацый з задачамі, якія высунуты ЦК УсеКП(б) у адозьве ад 3 верасьня аб ліквідацыі прарываў у прамфінпляне і бязумоўнага забясьпячэньня выкананьня праграмы трэцяга году пяцігодкі. Значэньня дэлегацкіх сходаў, як аднаго з прывадных пасаў ад партыі да шырокіх мас працоўных жанчын, патрэбнасьці ператварыць дэлегацкія сходы ў баявыя ўдарныя брыгады па ажыцьцяўленьні гаспадарчых і палітычных задач у горадзе і ў вёсцы—гэтага не разумеюць некаторыя партарганізацыі і надалей дапускаюць у разгортваньні работы сярод жанчын недапушчальную бязьдзейнасьць.

Даводзіцца сустракацца з фактамі су процьстаўленьня агульнай работы на прадпрыемстве рабоце сярод жанчын. Сакратар бюро парткалектыву фабрыкі «Чырвоная Зорка», ВАСІЛЕЎСКІ (Чашніцкі раён) ня ведае, як кіраўнік парт-арганізацыі, аб чым гаварыць на дэлегацкім сходзе. Гэта ў той час, калі ў вытворчай рабоце на фабрыцы ёсьць рад буйных прарываў. Аб мабілізацыі актыўнасьці жанчын-работніц вакол задач выкананьня прамфінпляну сакратар партарганізацыі ня лічыць патрэбным ставіць пытаньне на сходзе рабочых, спасылаючыся на перагрузку рабочых частымі сходамі.

У той час, калі выяўлена поўная бязьдзейнасьць парт'ячэек ЧАШНІЦКАГА раёну ў адносінах праядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў і рэальная пагроза зрыву гэтай кампаніі, член бюро РК на нарадзе камуністых, якія пасылаліся ў сельсаветы для работы па калектывізацыі, забараніў райжанарганізатару гаварыць аб дэлегацкіх сходах. Горш за ўсё, што такі недапушчальны падыход да правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў не зьяўляецца тыповым для аднаго толькі Чашніцкага раёну. Недаацэнка работы сярод працоўных жанчын мае месца ў радзе ячэек і нават раённых партарганізацый.

ЦК КП(б)Б ў пачатку кастрычніка месяца адзначаў нездавальняючую работу з боку партарганізацый па разгортваньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў і прапанаваў райкомам і парткалектывам ужыць усе неабходныя захады для выкананьня дырэктыў ЦК па гэтым пытаньні.

Партарганізацыі павінны стаць на чале ўзрастаючай актыўнасьці работніц і працоўных жанчын і накіроўваць гэту актыўнасьць на пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач рэканструкцыйнага пэрыяду. У адпаведнасьці з гэтымі задачамі трэба перабудаваць усю работу дэлегацкіх сходаў. Трэба дабіцца карэннага пералому ў рабоце партарганізацый сярод працоўных жанчын. Усякая недаацэнка гэтае работы, супроцьстаўленьне яе іншым задачам павінны сустракаць рашучы адпор.

«Пэрыяд гігантскага размаху сацыялістычнага будаўніцтва, складаныя задачы, якія стаяць перад пралетарыятам ва ўмовах абвастрэньня класавай барацьбы, патрабуюць выключнай увагі з боку партарганізацый да работы сярод шырокіх працоўных мас жанчын»... (З пастановы ЦК УсеКП(б).

Папярэдзіць зрыў

Парт'ячэйкі Пухавіцкай арганізацыі нічога не зрабілі, каб перавыбары дэлегацкіх сходаў, прайшлі, як палітычна-масавая кампанія. Фармальна, а ў радзе выпадкаў недапушчальна-нядбайна аднесьліся ячэйкі да правядзеньня гэтай важнейшай кампаніі. Гэта давяло да таго, што ў радзе пунктаў справаздачна-перавыбарчыя сходы былі сарваны. А там, дзе перавыбары і адбыліся, кандыдатуры ў новы склад дэлегацкіх сходаў не абмяркоўваліся па актыве, сходах беднаты і т. д. У раёне вусім не складзена грамадзкая думка вакол перавыбараў дэлегацкіх сходаў. Нова-выбраныя сходы не забясьпечаны кіраўнікамі.

Раённы камітэт партыі вызначыў арганізаваць у раёне 27 дэлегацкіх сходаў, даў дырэктывы ячэйкам, але дадзей гэтага не пашоў. Ён не праверыў, як парт'ячэйкі ажыцьцяўляюць на практыцы дырэктыву райкома. Да прыезду прадстаўніка ЦК КП(б)Б з раёну ня быў пасланы ні адзін таварыш для правядзеньня перавыбараў. Уся работа была ўвалена на жанарганізатара.

У калгасе «Новае жыцьцё» (Валоцкі сельсавет) мясцовыя арганізацыі зусім нічога не зрабілі для падрыхтоўкі да перавыбараў дэлегатак. Нават не падумалі забясьпечыць сход памяшканьнем. Прыблізна тое-ж было самае і ў калгасе «Новае лядно».

У апошні час райком выдучыў для правядзеньня перавыбараў дэлегатак 12 чалавек з раённага актыву. З гэтай колькасьці толькі двое прыступілі да работы, а іншыя... «заняты больш важнай работай».

Пухавіцкая арганізацыя стаіць перад фактам зрыву важнейшай кампаніі. Для яго папярэджаньня патрэбны тэрміновыя і рашучыя меры з боку райкому партыі.

ЮШКЕВІЧ.

Далей пастановы не пашлі

(Аршанскі раён)

Яшчэ 14-га верасьня на пасяджэньні бюро парткалектыву Асінбуду было пастановлена: арганізаваць дэлегацкія сходы пры ячэйках у Выдрыцах, Арохах і Шабанох; паставіць пытаньне аб справаздачных дэлегацкіх сходах на парт'ячэйках, ячэйках ЛКСМБ, агульных сходах; вылучыць кіраўніка дэлегацкіх сходамі; вызваліць іх ад іншых абавязкаў; перавыбарчыя сходы пачаць з 17-га верасьня з такім разьлікам, каб скончыць іх да 1-га кастрычніка; насьцепгазэтам пачаць шырокую растлумачальную кампанію і цэлы рад іншых практычных прапаноў.

Ячэйкі гэтай дырэктывы і на сёньня ня выканалі, а бюро парткалектыву не праверыла выкананьня сваёй пастановы да гэтага часу.

Кампанія перавыбараў дэлегацкіх сходаў на Асінбудзе правалена.

Трэба ўзварушыць грамадзкасьць, трэба мабілізаваць усіх партыйцаў і камсамольцаў і зараз-жа ўзяцца за работу.

Далейшая маруднасьць у гэтай рабоце недапушчальна!

Рабкораўская брыгада:
АЛЯХНОВІЧ, КУБРАКОЎ.

Не на словах, а на справе

На справаздачна-перавыбарчым сходзе дэлегатак мястэчка **Мяжы** было абмеркавана пытаньне аб дні ўдарніка. Жанчыны, работніцы, калгасьніцы і жонкі рабочых правялі вялікую актыўнасьць у выраішэньні пытаньня дня ўдарніка. Сход ухваліў канкрэтную пастанову прымаць удзел у рэалізацыі пазыкі Пяцігодка — за 4 гады», арганізацыі пяцідзённых груп па калгасным руху, ліквідацыі няпісьменнасьці, паляпшэньні працы і быту сялянак і т. д.

Выбары дэлегатак прайшлі актыўна. Сяго абрана **15** чалавек. Сход пастанавіў арганізаваць пры клюбе дзіцячкой на час правядзеньня агульных сходаў.

Пастанова дэлегацкага сходу **рэалізаваны практычнай работай.** Тут-жа на сходзе была праведзена падпіска на **150** руб. пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады». Арганізавана ўдарная брыгада па наладжаньні чырвоных абозаў у дзень 1-га кастрычніка. Дэлегаткі — **Кавалёва, Халеева, Дыбкіна, Зубрыцкая, Касмакова і Іванова** прынялі ўдзел у абмалоце сялянскага збожжа і арганізацыі чырвонага абозу. У выніку гэтае работы чырвоным абозам здана 21 цэнтрознага збожжа, 13 цэнт. бульбы, 2 тоны сена і 3 цэнт. саломы. Дэлегаткі прынялі актыўны ўдзел у зборы мяшкоў.

Жанчыны, работніцы і калгасьніцы свае пастановы справаздачна-перавыбарчага сходу ўвялі з практычнай работай па выкананьні галоўнейшых задач партыі на вёсцы.

Паўлаў і Гіліна.

За рашучыя меры барацьбы супроць правых апартуністых

Агентуру кулацтва гнаць з бальшавіцкіх радоў

Лідэры правых павінны на справе давесьці сваю адданасьць УсеКП(б)

Агульны сход партыйнага і камсамольскага калектываў друкарні імя Сталіна, заслухаўшы інфармацыю аб двурушніцкіх манэўрах правых апартуністых, цалкам і поўнасьцю ўхваліў пастанову ЦКК УсеКП(б) аб выключэньні з радоў партыі правага апартуніста Руціна, які, прызнаючы на словах генеральную лінію партыі, праводзіў двурушніцкую палітыку, вёў фракцыйную барацьбу супроць партыі і яе генеральнай лініі, уступаючы ў саюз з контр-рэвалюцыйным трацкізмам.

Рашуча ўхваляючы здрадніцкую палітыку правых апартуністых, агульны сход з абурэньнем адзначае ганебнае маўчаньне лідэраў правай апазыцыі, якое спрыяе ажыўленьню правых апартуністых і разам з гэтым, садзейнічае канцэнтрацыі вакол плятформы правых апартуністых усіх варожых кулацка-капіталістычных элемэнтаў.

Сход патрабуе ад лідэраў правай апазыцыі, у прыватнасьці ад Бухарына, спыніць свае двухсэнсоўнае маўчаньне і выказаць свае адносіны да пастановы XVI зьезду УсеКП(б), на справе давесьці партыі сваю адданасьць яе генеральнай лініі ў барацьбе супроць ухілаў ад партыйнай лініі, у першую чаргу з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе. Сход патрабуе ад партыйных органаў ужыць суровыя меры ў адносінах правых апартуністых, — кулацкай агентуры ў партыі, поўнасьцю дастасаваць да іх пастановы партзьезду аб несумяшчальнасьці праваапартуністычных поглядаў з прабываньнем у партыі.

Сход парткалектыву заклікае ўсіх партыйцаў і камсамольцаў друкарні паняволіць клясавую пільнасьць, павысіць сваю актыўнасьць, накіраваць яе на справу пасьпяховага выкананьня пяцігадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі за чатыры гады.

Проч здрадніцкаў з радоў бальшавіцкай партыі!

Няхай жыве сталёвае адзінства УсеКП(б)!

Няхай жыве яе бальшавіцкі ЦК!

* * *

Агульны адкрыты сход ячэйкі КП(б)Б кэмфармэзаводу, заслухаўшы інфармацыю аб выключэньні з партыі правага апартуністага Руціна, цалкам і поўнасьцю ўхваляе рашучыя меры ЦК УсеКП(б) у адносінах да двурушнікаў, здраднікаў партыі — правых апартуністых.

Сход патрабуе ад лідэраў правага ўхілу неадкладна выказаць свае погляды і адносіны да пастановы XVI зьезду УсеКП(б) і ў барацьбе супроць правых апартуністых, за генеральную лінію партыі, давесьці сваю адданасьць УсеКП(б).

У пэрыяд разгорнутага пераможнага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце капіталістычныя элемэнты — кулак і нэпман аказваюць шалёнае супраціўленьне ажыцьцяўленьню пастановы партыі.

Правыя апартуністыя, зьяўляючыся кулацкай агентурай у партыі, абараняючы капіталістычныя элемэнты, імкнуцца сарваць высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Партыя павінна бязьлітасна выганяць са сваіх радоў двурушнікаў, здраднікаў партыі — правых апартуністых. Самыя шырокія партыйныя масы заўсёды стаялі і будуць стаяць па варце ленінскай генеральнай лініі партыі!

У рады ўдарніц

Па СМАЛЯВІЦКІМ РАЁНЕ перавыбары дэлегатак пачаліся з 7-га кастрычніка. Для практычнага правядзеньня перавыбараў і падрыхтоўкі да іх было накіравана ў вёску каля 60 брыгадзіраў — раённых работнікаў і рабочых г. Менску, што працуюць у раёне. Асобныя брыгадзіры заключылі паміж сабою дагавары на лепшае, больш масавае правядзеньне перавыбараў.

Кампанія па перавыбарах дэлегатак была шчыльна ўвязана з задачамі ліквідацыі прарываў у правядзеньні с.-г. мерапрымстаў (капаньне бульбы, сяўба і інш.) па калгасах і саўгасах.

Папярэднія весткі гавораць аб тым, што перавыбары дэлегацкіх сходаў прайшлі пры шырокім удзеле работніц саўгасаў, калгасаў і бядняцка-середняцкіх мас сялянак. Усяго па раёне арганізавана 27 дэлегацкіх пунктаў: чатыры пры саўгасах і 23 у калгасах. Дэлегаткамі гэтых пунктаў выбраны таксама бяднячкі ды середнячкі-адзіначкі.

Перавыбары павысілі актыўнасьць с.-г. работніц і калгасьніц. Яны пачалі ўступаць у рады ўдарніц. Так, у Забалоцкім, Юраўскім і інш. сельсаветах АРГАНІЗАВАНЫ ЎДАРНЫЯ ГРУПЫ ДЭЛЕГАТАК. Гэты ўздым актыўнасьці, які наглядаўся ў перавыбарчую кампанію, трэба замацаваць для больш шырокага ўцягваньня працоўных жанчын у справу сацыялістычнага будаўніцтва.

ШУСТАР.

Нізавы друк на штурм ударнага кварталу

Зусім зразумела, што ўся наша работа ўдарным рашаючым квартале вінна зводзіцца да адной асноўнай задачы: — шырэйшай рэалізацыі адозвы ЦК. Толькі выходзячы з гэтага становішча, трэба меркаваць аб мэтадах нашае работы на тым ці іншым канкрэтным вучастку рашаючага кварталу і падрыхтоўцы да трэцяга году пяцігодкі.

Ня менш важным вучасткам у рэалізацыі адозвы ЦК зьяўляецца наш нізавы друк. Але без апэрацыйнасьці, без сапраўднай жывой творчай ініцыятывы і прыстасаваньня работы шматтыражкі, насьценнай газэты да ўдарнага кварталу, наш нізавы друк будзе адставаць ад агульных тэмпаў ударнае работы.

Праводзячы агляд некалькіх апошніх нумароў шматтыражак, прыходзіцца канстатаваць, што некаторыя з іх ужо зрабілі першыя крокі для перабудовы мэтадаў сваёй работы, да пераходу на апэрацыйную работу.

Ініцыятыва бюро парткалектыву Палесьдруку, на-баявому падхопленая шматтыражкай **«Ратацыя»** аб арганізацыі вытворчым манэўраў заслугоўвае асаблівай увагі ўсіх шматтыражак і насьценгазэт БССР. У часе манэўраў «Ратацыя» выходзіла праз кожныя 3 дні. «Ратацыя» поўнасьцю справілася са сваёй задачай.

Цікавы вопыт у галіне праверкі ўдарнай работы ў цэхах правяла рэдкалегія шматтыражкі «Чырвоная Бракамолка» (Дзбруш), шляхам арганізацыі грамадзкага суда над механічным цэхам за дрэнныя рамонты тэхнічнага абсталяваньня, за агідна марудныя тэмпы выкананьня патрэбных рамонтаў, чым выкліканы шматгадавымі прастоі. Гэты вопыт вельмі карысны, бо ён мабілізуе грамадзкую думку рабочых на вузкія месцы прадпрыемства.

Не адстае ў галіне пранікненьня творчае ініцыятывы шматтыражка **«Чырвоны Молат»** (завод «Энэргія», Менск), якая ў сваім апошнім нумары бічуе прагульшчыкаў заводу і высунула прапанову арганізаваць для прагульшчыкаў спэцыяльную касу для выплаты пэнсіі. У «дзень ударніка» на масавым вечары рабочых заводу, рэдкалегія перадала прагульшчыкам сьцяг з рагожы. Гэтыя мэтады масавай уздзейнасьці на прагульшчыкаў заслугоўваюць увагі.

«Друкарская Праўда» (БДВ, Менск), адзін з апошніх нумароў газэты пішычае пераходу друкарні на 7-гадзінны рабочы дзень і аналізу ўдзелу камсамольцаў за ўдарных брыгадах. Пытаньне вельмі важнае, бо на чартыёнах і камсамольцах павінны раўняцца беспартыйныя рабочыя. Выяўленьне насьчэпасьці ўдарных брыгад партыйцамі і камсамольцамі зьяўляецца бясспрэчна добрай ініцыятывай рэдкалегіі. Лазунг камсамолу аб 100-процантным уцягненьні рабочае моладзі і камсамольцаў у рады ўдарнікаў, павінен быць выкананы. Даволі пышна ўзьнімаецца ў гэтым нумары думка рабочых-ударнікаў аб упушчальненьні рабочага дня, у выніку з пераходам на 7-гадзінны рабочы дзень.

Зараз некаторыя фабрычна-заводзкія газэты праводзяць агляд ударнай работы. Шматтыражка **«Дняпровец»** (Рэчыца) прывяла рабкораўскі рэйд для выяўленьня стану ўдэфіцыта па заводзе. З агульнага ліку 29 ударных брыгад толькі 12 аформлены, а рэшта — 17 лічацца на паперы. Ня ўсе яшчэ 144 ударнікі заводу ведаюць аб сваіх задачах. Шматтыражка **«Сельмашац»** (Гомель) у апошніх нумары зьмяшчае заметку пад назвай «Ударныя на справе ці ў друкосьсях». З гэтага відаць, што газэты правільна зразумелі свае задачы, што крытыка ўдарнай работы і выяўленьне ілжэ-ўдарніцтва павінна быць сыстэмай у рабоце нізавога друку.

Шматтыражка і насьценная газэта павінны таксама паказаць на старонках газэты жывыя прыклады работы ўдарных брыгад і асобных ударнікаў.

Характарыстыка ўдарніка і ўдарнай брыгады можа служыць стымулам для павялічэньня радоў ударнікаў і рабкораў па прадпрыемстве.

Падамо некалькі фактаў, якія таварищ аб адставаньні некаторых шматтыражак ад агульных тэмпаў будаўніцтва, ад сапраўднага жыцьця прадпрыемства.

Нідаўна «Зьвязда» сігналізавала ў зьмешчаным артыкуле «Гігант па тармазох» аб абураючых фактах апартунізму на заводзе «Сельмашу» ў Гомелі, дзе заводакіраўніцтва прыйшло па тэхнічную нараду з перапамешанымі лічбамі, што дэмабілізавала рабочую масу. Заводакіраўніцтва не дацаніла ўсіх рэальных матчымасьцяй заводу ў выкананьні прамфінпляну.

Праз 5 дзён пасьля зьмешчанага артыкулу ў «Зьвязьдзе», адбылася нарада заводзкага партыйнага і камсамольскага актыву, якая цалкам далучылася да ацэнкі «Зьвязды» аб кіраўніцтве заводу і аб фактах апартунізму. На жаль, шматтыражка заводу «Сельмашац» прамаргала гэтыя факты апартунізму. Заводская газэта свячасова ня выкрыла гэтага і не ўзьняла пытаньня перад шырокай рабочай масай. Праўда, пастановы бюро парткалектыву і нарады шырока асьвятлены 5 кастрычніка ў шматтыражцы «Сельмашац».

Другі яскравы факт праваапартуністычных памылак пры складаньні сустрэчнага прамфінпляну мы мелі на швэйнай фабрыцы «Кастрычнік», дзе таксама былі высунуты паменшаныя апартуністычныя лічбы па зьніжэньні сабекошту, дзе партыйная арганізацыя ня была мабілізавана на правядзеньне сустрэчнага прамфінпляну. Бюро парткалектыву не дало палітычнай ацэнкі высунутым адміністрацыяй мінімальным паказальнікам па зьніжэньні сабекошту. І тут таксама шматтыражка **«Голас працаўца»** свячасова не сігналізавала аб гэтым. Газэта ня была на чале арганізацыі сустрэчнага прамфінпляну. Шматтыражка апынулася ў такім становішчы, што ёй прыйшлося канстатаваць факты, якія ўжо адбыліся пасьля выпікаў Фрунзаўскага райкому КП(б)Б.

На абутковай фабрыцы два «камсамольцы» агітавалі супроць кантрактацыі рабочых да канца пяцігодкі, спэкулявалі труднасьцямі пяцігодкі, а ня ўзьнімалі гэта пытаньне на прынцыповую вышыню.

Трэба канстатаваць, што сустрэчны прамфінпляц, высунуты новым уздымам актыўнасьці рабочае клясы, натыкнуўся на сьцяну апартуністычных праяў на цэлым радзе прадпрыемстваў. Некаторыя гаспадарнікі спасавалі перад усімі рэальнымі магчымасьцямі прадпрыемства. Мы маем шмат фактаў памяншэньня лічбаў некаторымі гаспадарнікамі пры складаньні прамфінпляну. Фабрычна-заводзкія газэты павінны рашуча змагацца з усякімі праявамі апартунізму на практыцы і з перашкодамі, якія стаяць на шляху арганізацыі сустрэчнага прамфінпляну.

Падагульваючы вынікі агляду апошніх нумароў некаторых шматтыражак, прыходзіцца канстатаваць, што ня ўсе яшчэ пераключылі сваю работу на новыя формы і мэтады. Апэрацыйнасьць толькі пачынае ўводзіцца ў сыстэму работы газэт. Ня ўсе яшчэ газэты зьяўляюцца арганізатарамі сустрэчнага прамфінпляну. Ня ўсе яны свячасова ўзьнімаюць пытаньні аб апартуністычных праявах і перашкодах ударным тэмпам работы прадпрыемства.

Выходзячы з гэтага, усім нашым фабрычна-заводзкім газэтам трэба зараз-жа правесьці самапракерку сваёй работы, прыстасаваць сваю работу да ўмоў ударных тэмпаў рашаючага кварталу, перайсьці на сыстэму апэрацыйнасьці і ператварыць газэту ў штодзённае сапраўднае адлюстраваньне жыцьця прадпрыемства. Кожны дзень шырока асьвятляць на старонках нізавога друку работу ўдарных брыгад і ўдарнікаў і рашуча змагацца в усякімі праявамі апартунізму на практыцы.

ЦУДЗІН.

УСІМ ГАРАДЗКІМ І РАЁННЫМ КК РСІ

У зьвязку з тым, што ня ўсе раёны яшчэ ўключыліся ў рабселькораўскі рэйд і ў мэтах лепшага правядзеньня ўсебеларускагар эйду і падвядзеньня вынікаў—

усебеларускі рабселькораўскі рэйд працягнуць да 1 лістапада гэтага году.

Усім гарадзкім і раённым КК РСІ абгаварыць вынікі рэйду на пасяджэньні КК РСІ да 1 лістапада гэтага году.

Старшыні КК РСІ пры паездцы ў Менск на курсы-нарады павінны прывезьці з сабой вынікі і пастановы па рэйдзе.

ЦКК НК РСІ.

ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ!

Перабудаваць работу прафсаюзаў

Рашуча абнавіць і ўзмацніць кіраўніцтва ЦСПСБ

Сыгналы друку

правільныя і сваячасовыя

На бязьлітасную барацьбу з правым апартунізмам

Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ аб артыкулах у газэтах „Труд“ і „Зьвязда“*)

1. ПРЭЗЫДЫУМ ЦСПСБ, РАЗГЛЯДЗЕЎШЫ І АБМЕРКАВАЎШЫ АРТЫКУЛЫ «ТРУДА» І «ЗЬВЯЗДЫ» АБ СТАНЕ РАБОТЫ І КІРАЎНІЦТВА ЦСПСБ, ЛІЧЫЦЬ, ШТО ЗЬМЕСТ АРТЫКУЛУ ЗУСІМ ПРАВІЛЬНА АДЛЮСТРОЎВАЕ ЗНАЧНЫЯ ПРАРЫВЫ, ЯКІЯ ЁСЬЦЬ У РАБОЦЕ І КІРАЎНІЦТВЕ ЦСПСБ.

2. ПРЭЗЫДЫУМ ПРЫЗНАЕ, ШТО НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ШМАТЛІКІЯ ПРЫКЛАДЫ ГЭРАІЧНАЙ РАБОТЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ БССР ПА ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ, ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ, АРГАНІЗАЦЫІ СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ, МАГУТНЫ ЎЗДЫМ СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА, У РЭЗУЛЬТАЦЕ ЧАГО ЁСЬЦЬ БЯССПРЭЧНЫЯ ДАСЯГНЕНЬНІ Ў ГАСПАДАРЧЫМ І КУЛЬТУРНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ І САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ ВЁСКІ—ПРАФСАЮЗЫ БССР НЯ ЗДОЛЕЛІ ЎЗЬНЯЦЬ СВАЮ РАБОТУ НА ПАТРЭБНЫЯ ТЭМПЫ І ПА-САПРАЎДНАМУ АЖЫЦЬЦЯВІЦЬ ПАВАРОТ ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З ДЫРЭКТЫВАМІ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б І XVI ЗЬЕЗДУ УсеКП(б).

3. ПРЭЗЫДЫУМ ПРАПАНУЕ ЎСІМ ПРАФАРГАНІЗАЦЫЯМ ШЫРОКА ПРАПРАЦАВАЦЬ АРТЫКУЛЫ «ТРУДА» І «ЗЬВЯЗДЫ», РАЗГАРНУЎШЫ НАЙШЫРЭЙШУЮ САМАКРЫТЫКУ РАБОЧЫХ МАС ВАКОЛ УСЕЙ РАБОТЫ ПРАФОРГАНАЎ, І НА ПАДСТАВЕ ПАСТАНОЎ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б І XVI ЗЬЕЗДУ УсеКП(б) і АДОЗВЫ ЦК УсеКП(б)—ВЫПРАЎЛЯЦЬ КІРАЎНІЦТВА, СЫСТЭМУ І ЗЬМЕСТ ПРАФРАБОТЫ ЗЬВЕРХУ ДАНІЗУ. ПРАПРАЦОЎКУ ПАТРЭБНА СКАРЫСТАЦЬ ДЛЯ РАШУЧАЙ ПЕРАБУДОВЫ ПРАФРАБОТЫ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ МАС НА ВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАЧ ЎДАРНАГА ТРОХМЕСЯЧНІКА І ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ І НА РАШУЧУЮ БЯЗЬЛІТАСНУЮ БАРАЦЬБУ З ПРАВЫМ АПАРТУНІЗМАМ У ТЭОРЫІ І ПРАКТЫЦЫ ПРАФРУХУ БССР.

*) Падаем поўны зьмест пастановы прэз. ЦСПСБ, якая ўчора зьмешчана ў скарочаным выглядзе.

Ніхто ня цікавіцца

Тав. ЭПШТЭЙН—сакратар парт'ячэйкі ф-кі „Беларуска“

— У часе падрыхтоўкі да ўдарнага кварталу і тады, калі хваля сацспаборніцтва і ўдарніцтва толькі ўзьнімалася, мы ня мелі ніякай дапамогі з боку ЦСПСБ.

ЦСПСБ арганізавала паход на прадпрыемствы, але на нашай фабрыцы мы ня бачылі ня толькі членаў прэзыдыуму ЦСПСБ, але і членаў прэзыдыуму нашага саюзу, якія павінны былі пацікавіцца становішчам фабрыкі.

Калдагаворная кампанія — работа, у якой удзел прафсаюзаў неабходны, у нас на фабрыцы праходзіць бяз усякай дапамогі саюзу.

Падрыхтоўка да вытворчых манэўраў праходзіць таксам без кіраўніцтва і дапамогі з боку прафсаюзаў. АЛЕ МЫ НЯ БУДЗЕМ ЧАКАЦЬ ДАЛЕЙШЫХ ДЫРЭКТЫЎ ЦСПСБ ПА ГЭТЫМ ПЫТАНЬНІ. 25 кастрычніка ўключаемся ў вытворчыя манэўры і будзем прасіць, каб нашу фабрыку ўключылі ў конкурс на лепшае прадпрыемства.

Ні разу ня бачылі прадстаўніка ЦСПСБ

Тав. Мэцк, сакратар парткалектыву заводу „Полымя рэвалюцыі“

— Прафработа на заводзе «Полымя рэвалюцыі» ДАГЭТУЛЬ НЕ ПЕРАБУДАВАНА І НЕ ПЕРАНЕСЕНА Ў ЦЭХІ. Белкамітэт саюзу мэталістых чамусьці ня можа ўстанавіць структуру цэхкамітэтаў.

То-ж самае і з калдагаворамі. Правялі стары калдагавор, а да складаньня новага так і ня прыступілі. Фактычна на заводзе цяпер няма калдагавору. Белкамітэт спазьніўся з выпрацоўкай праекту новага дагавору.

Завод мае рад буйных дасягненьняў у выкананьні прамфінпляну і ў гэтай галіне ідзе на другім месцы ў БССР. Аднак, посьпехі рабочых НЕ ЗАМАЦАВАНЫ.

НА ЗАВОДЗЕ НІ РАЗУ НЯ БАЧЫЛІ ПРАДСТАЎНІКА ЦСПСБ. Толькі ў дзень паходу адказных прафработнікаў на прадпрыемствы на заводзе быў тав. Каменштэйн, які даў значную практычную дапамогу ў рабоце заўкому.

Казённая дырэктыва

Тав. ФІШБЕЙН— старшыня вытворчага сектару

— Дапамога з боку ЦСПСБ у арганізацыі сустрэчнага выявілася ў тым, што старшыня ЦП саюзу зьявіўся на сход рабочых, дзе ўжо зацьвярджалі сустрэчны прамфінплян.

Культсэктар ЦСПСБ нічога не зрабіў, каб павярнуць культработу тварам да вытворчасьці.

Перад перавыбарамі фабзаўмясцкомаў наш фабком атрымаў казённую дырэктыву:

— ДА ПЕРАВЫБАРАЎ ФАБЗАЎМЯСЦКОМУ РАБОТЫ ФАБКОМА НЕ ПЕРАБУДОЎВАЦЬ.

Мы чакалі, што ЦП дапаможа нам перабудаваць работу пасьля перавыбараў. Але прайшло 2½ месяцы і на фабрыцы ня было ні разу прадстаўніка ЦП.

Прафработа па-старынцы

Тав. Фамлюк, ударнік, майстар—шкладуў гуты „Пралетары“

— Заўком у нас новы, але прафработа часта вядзецца па-старынцы. На заводзе няма нават вытворчай намісіі. Вытворча-эканамічны сэктар бязьдзейнічае.

Рабочыя прапановы часта марынуюцца месяцамі і не рэалізуюцца. З 14 прапаноў рэалізавана ўсяго 6. Рацыяналізатар, зьяўляючыся адначасова і памоцнікам дырэктара, больш заняты адміністрацыйнымі функцыямі, чым рацыяналізацыяй вытворчасьці.

— Аб рабоце ЦСПСБ мы даведваемся толькі з газэт.

„Угробілі“ добрае пачынаньне

Тав. РУБЕНЧЫК—чл. заўкому зав. „Дрэвааапрацоўшчык“

ЦСПСБ увесь час крычыць, што прафсаюзная работа кульгае таму, што няма падрыхтаваных кадраў прафсаюзных работнікаў.

Аднойчы да нас на завод прыйшоў работнік ЦСПСБ тав. ЮДОЎСКІ, і завербаваў рабочых у інстытут добраахвотнікаў прафработнікаў. Але ЦСПСБ ні разу не сабраў завербаваных. Група добраахвотнікаў не пачаўшы работы, распалася.

Ідэя вытворчых манэўраў не падхоплена

Тав. Рагавенка, ударнік, памоцнік машыністага дэпо ст. Менск

— Лічу, што ЦСПСБ і Белбюро ЦК чыгуначнікаў аддаюць вельмі мала ўвагі рабоце дэпо ст. Менск. Паміж тым, дэпо мае рад прарываў у выкананьні прамфінпляну.

Калдагаворная кампанія толькі цяпер пачала разгортвацца, але ўсё-ж ударных тэмпаў у гэтай рабоце няма.

ІДЭЯ ВЫТВОРЧЫХ МАНЭЎРАЎ НЕ ПАДХОПЛЕНА ЧЫГУНАЧНІКАМІ МЕНСКУ. Кіраўніцтва ў гэтай справе з боку вышэйшых прафорганаў няма.

Тое-ж самае і з уключэньнем ва ўсесаюзны конкурс. Толькі ўчора прынялі пастанову аб абвяшчэньні конкурсу на лепшага машыністага.

ЦСПСБ абяцаньне ня выканаў

Тав. Сьцепанюк, старшыня гуты „Пралетары“

— Культбрыгада ЦСПСБ, якая нядаўна наведала завод, абяцала прымацаваць да яго работніка для правядзеньня культагляду. Аднак, абяцаньне гэта так і ня выканана: ЦСПСБ ня даў нам культработніка.

За першую дэкаду кастрычніка «Пралетары» выканаў прамфінплян на 110 проц., а за другую дэкаду—на 85 проц. Прарыў паглыбляецца. На заводзе абвалілася труба, ванная печ не ў парадку, павялічыўся бой.

Нам, як нікопі, патрэбна цяпер ДАПАМОГА з боку вышэйшых прафорганаў. На жаль, мы гэту дапамогу маем не заўсёды.

Без праверкі выкананьня дырэктыў

Тав. Сяліцкі, ударнік—электраманцёр заводу „Полымя рэвалюцыі“

— Жывога кіраўніцтва ЦСПСБ на заводзе не адчуваецца. ЦСПСБ і Белкавяраюць, як ажыцьцяўляюцца іх дырэктывы на мясцох.

Падрыхтоўка прафкадраў праходзіць слаба. Няма кіраўніцтва нізавым прафактывам. Уся работа па выхаваньні прафактыву праходзіць самацёкам. Не наладжана культурная работа.

З 32 рабочых прапаноў рэалізавана ТОЛЬКІ 11. Рабочыя ніколі ня ведаюць, які лёс іх прапаноў.

Кіраўніцтва прафрухам не аддае выстарчальнай увагі пытаньням рабочага вынаходніцтва. Кіраўніцтва гэтай справай няма.

Без дапамогі

Тав. Годзін, старшыня мясцкому № 2 чыгуначнікаў

— У вагонных майстэрнях Менску працуе 350 чал. Ніякай сувязі з ЦСПСБ у нас няма. Ні разу прадстаўнік ЦСПСБ не праводзіў гутаркі з рабочымі майстэрні малога рамонту. Такое самае становішча і ў адносінах Белбюро ЦК чыгуначнікаў. За 5 месяцаў мы толькі адзін раз бачылі члена прэзыдыуму Белбюро і тое тады, калі трэба было скасаваць выбары МН.

Майстэрні малога рамонту скончылі гаспадарчы год на два дні раней тэрміну. Сабекошт зьніжаны на 80 проц. супроць заданьня ў 14 проц. За добрую работу майстэрні атрымалі прэмію ў 500 руб.

Ня гледзячы на гэтыя посьпехі, майстэрні НЯ ЎКЛЮЧЫЛІСЯ ВА ЎСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА.

Няма практычнай дапамогі з боку ЦСПСБ і Белбюро.

Як мы зьвязаны з замежнымі рабочымі?

„Энэргія“ пачынае пераклічку аб становішчы міжнароднай сувязі

Скарыстаць вопыт замежных рабочых для тэхнічнай кансультацыі

Зусім нядаўна, некалькі месяцаў таму назад, рабочыя заводу «Энэргія» даслалі свой ліст рабочым мэталістым гор. **Лейпцыгу.** Ініцыятарам гэтага лісту зьявілася ячэйка эспэрантыстых на заводзе. Праект лісту быў потым абм

ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА

Чырвоныя эшалёны з бульбай—пралетарскім цэнтрам Саюзу

Лоеўскі, Старадароскі, Любаньскі, Чырвонапольскі, Старобінскі, Асіпавіцкі, Чарэйскі і Юравіцкі раёны зрываюць адгрузку бульбы

Замест 400 вагонаў штодзенна грузіцца толькі 120

У ЛЮБАНЬСКІМ РАЁНЕ кулакі не атрымалі цьвёрдых заданьняў

Ударыць па апартуністых, якія зрываюць забесьпячэньне пралетарскіх цэнтраў

МЕНСК, 25 кастрычніка

Становішча адгрузкі бульбы ў пралетарскія цэнтры застаецца пагражаючым. Кастрычнік ня толькі ня даў узмацненьня тэмпаў, а наадварот—зьнижаньне адгрузак.

Замест мінімальна патрэбных 400 вагонаў адгружаецца як і раней штодзенна 100-120 вагонаў.

У часе асеньніх загатовак у пралетарскія цэнтры Саюзу павінна быць вывезена 175.000 тон бульбы. На 20 кастрычніка вывезена толькі 67.000 тон—38,3 проц. плану. Плян забесьпячэньня прамысловасьці бульбай выкананы толькі на 15 проц.

Значынна марудны тэмп адгрузкі тлумачыцца выключна тым, што райкомы і райвыканкомы ўсё яшчэ мала мабілізавалі налёўныя ў раёне сілы на выкананьне пляну загатовак і адгрузкі бульбы.

Вывазу бульбы, забесьпячэньню пралетарскіх цэнтраў не наданы сапраўды баявыя тэмпы, якія павінны быць пры выкананьні важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы.

У раёнах усё яшчэ ня зьнішчаны настрої самацёку. Няма належнага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі, якія сабатуюць выкананьне цьвёрдых заданьняў па здачы бульбы. У адносінах да кулака не ліквідавана «благодушие» і чаканьне, што кулак сам здасьць бульбу. Так, у Любаньскім раёне да гэтага часу цьвёрдыя заданьні не даведзены да пасобных кулацка-заможных гаспадарак.

Адстаюць у выкананьні сваіх пляноў таксама і калгасы. У большасьці раёнаў бульба ў калгасах ужо выкапана, але узмацненьня вывазу і здачы калгасных бульбы яшчэ няма. Кіраўнікі раёнаў лічаць, што калгасная бульба ад іх не ўцячэ, што часу яшчэ многа, што няма чаго сьпяшацца.

Вельмі дрэнна працуюць таксама загатоўчыя арганізацыі і транспарт. Ёсьць рад выпадкаў, калі на прыстанях ляжаць тысячы тон бульбы, якая ня вывозіцца з-за адсутнасьці транспарту. У той-жа час ёсьць факты, калі загатоўчыя арганізацыі даюць нарады на вагоны без усякага пляну. У Спуцку загатоўцы патрабавалі 71 вагон пад бульбу. Гэтыя вагоны былі паданы, але загатоўчыя арганізацыі здолелі адгрузіць толькі 17 вагонаў. Рэшта вагонаў ня была выкарыстана.

Кастрычнік ужо канчаецца. Часу для перавозкі бульбы засталося вельмі мала. Для таго, каб мы не апынуліся перад фактам невыкананьня сваіх абавязкаў па забесьпячэньні пралетарскіх цэнтраў, не пакінулі прамысловасьць без сырцу,—неабходна зараз-жа ўзяць сапраўды баявыя тэмпы.

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністых, якія зрываюць плян забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў. Работнікі, якія ня здолелі выканаць пляны, павінны быць зараз-жа зьмешчаны.

Пляны рэальныя і пры бальшавіцкіх тэмпах работы заданьне па забесьпячэньні пралетарскіх цэнтраў будзе свапавінны быць зараз-жа зьменены.

Фарсаваць адгрузку на Маскву

УЧОРА НА АДРАС САЎНАРКОМУ, НАРКАМГАНДЛЮ І БЕЛПЛОДАГАРОДНІНЫ АТРЫМАНА З МАСКВЫ НАСТУПНАЯ ТЭЛЕГРАМА:

— ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ МАСКВЫ БУЛЬБАЙ З БССР З КОЖНЫМ ДНЁМ ПАГАРШАЕЦЦА. ПЛЯН ЗАВОЗУ БУЛЬБЫ НА 21 КАСТРЫЧНІКА ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 39 ПРОЦ. СТВАРАЕЦЦА РЭАЛЬНАЯ ПАГРОЗА ЗРЫВУ ПЛЯНУ СТВАРЭНЬНЯ ЗІМОВЫХ ЗАПАСАЎ.

НАСТОЙВАЕМ ВЫКАНАЦЬ НАШ НАРАД І ФАРСАВАЦЬ АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ.

Прэміі—лепшым па ўборцы калгасам

Прэзыдыум Беларускага рэспубліканскага камітэту саюзу сельгаспесрабочых пастанавіў прэміяваць 6 саўгасаў, якія датэрмінова скончылі ўборку бульбы.

Радыё з трансьляцыяй ва ўсе рабочыя кватэры прэміюецца саўгасы ВІЛЕНЬ-САНЧА, ХАРОМЦЫ, («Сьвінавод») і БАРЫСАЎШЧЫЗНА (Бельсельтрэст), якія скончылі ўборку бульбы да 20-га кастрычніка.

Бібліятэкамі ўзнагароджваюцца саўгасы Пагост, Бацэвічы і Несяты.

Прэзыдыум камітэту саюзу прапанаваў усім саўгасам, якія скончылі ўборку бульбы, зараз-жа арганізаваць дапамогу суседнім саўгасам і калгасам, якія яшчэ ня скончылі ўборку, шляхам пасылкі лепшых ударнікаў, арганізатараў уборкі, а таксама дапамагчы ім рабочай цягавай сілай.

Рабочкомам саўгасаў, якія скончылі ўборку, правесьці да 1-га лістапада агульныя сходы рабочых, на якіх абгаварыць вынікі ўборкі бульбы і прэміяваць лепшых ударнікаў.

Ход уборкі бульбы па саўгасах

Паводле даных Наркамзему БССР, саўгасы на 20 кастрычніка ўбралі 6.757 га бульбы і кораньплоду, што складае 70 проц. пляну. На 15 кастрычніка саўгасамі было ўбрана 40 проц. плошчы, занятай бульбай і кораньплодамі.

Лепш за ўсіх правялі ўборку САЎГАСЫ ІЛЬНАВОДНАГА АБ'ЯДНАНЬНЯ, якія поўнасьцю ўбралі бульбу з поля.

Саўгасы Насентрэсту ўбралі 81 проц.; саўгасы Сьвінаводтрэсту—56 проц., Бельсельтрэсту — 80 проц. плошчы, занятай бульбай.

Бешанковіцкія каапэратары сарвалі бульбазагатоўкі

Віцебскае дзяржпараходзтва тармозіць адгрузку

БЕШАНКОВІЧЫ. Загатоўка бульбы ў раёне сарвана. Замест 5.280 тон, вызначаных плянам, загатоўлена 979 тон. Райспажыўсаюз выканаў 24 проц. заданьня. Райкаапсаюз — 20 проц.

Раённыя арганізацыі ня прынялі своечасовых мер для узмацненьня загатовак. Ня ўсюды праведзены сходы. Некаторыя ёўскі пераменшылі свае заданьні. Цьвёрдыя заданьні кулацкім гаспадаркам даны толькі ў 6 сельсаветах. Не адчуваецца кантролю за выкананьнем заданьня.

Пагражаючае становішча з адгрузкай бульбы і садавіны. Віцебскае дзяржпараходзтва тармозіць адгрузку ў Віцебск і Полацак, — бульба ляжыць на прыстані і гніе. На пункце скапілася 20 вагонаў яблык. Патрэбны тэрміновыя меры, каб адгрузіць загатоўленую прадукцыю.

Брыгада — **З. Тайц, Сенчэнка.**

Спажыўкаапэрацыя ня выконвае сваіх абавязацельстваў

Адгружана 42 тысячы тон замест 100 тысяч

Спажыўкаапэрацыяй БССР за асеньні перыяд павінна быць вывезена за межы БССР 100.000 тон бульбы. На 23 кастрычніка вывезена ўсяго 42.900 тон, што складае 42,9 проц. пляну.

Гад раёнаў ганебна зрывае вывад бульбы для забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў. Асабліва адстаюць спажыўтаварыствы наступных раёнаў: **Любаньскі** раён выканаў 8 проц. пляну вывазу, **Парыцкі**—12 проц., **Глускі**—14,7 проц., **Койданаўскі**—17,4 проц., **Лагойскі**—17 проц., **Калінкавіцкі**—21,7 проц., **Пятрыкоўскі**—17,8 проц., **Чырвонапольскі**—18,7 проц., **Уваравіцкі**—20 проц. і г. д.

Глускі, Брагінскі, Смалявіцкі, Калінкавіцкі, Асіпавіцкі і інш. райвыканкомы, як гледзячы на пастанову Эканада 5 кастрычніка—абмяжоўваюць дзейнасьць спажывецкай каапэрацыі, вызначаючы толькі некаторыя сельсаветы, дзе спажыўкаапэрацыя можа весьці загатоўкі, зьмяншаюць пляны вывазу і г. д.

У Хойніцкім і Брагінскім раёнах (паводле слоў члена праўленьня Белкаапсаюзу т. Рубіна), цьвёрдыя заданьні за гэтага часу яшчэ не даведзены да кулацка-заможных гаспадарак. Ні адзін кулак у гэтых раёнах ня прыцягнут да адказнасьці за невыкананьне заданьняў.

Упаўнаважаныя, якія прымацаваны да сельсаветаў, сядзяць больш у раённых цэнтрах, на вёску зьяўляюцца толькі як гастралёры, і не адчуваюць ніякай адказнасьці за выкананьне пляну сельсавету, да якога яны прымацаваны.

Праўленьне Белкаапсаюзу перадала пракурору для прыцягненьня да адказнасьці сьпіс раёнаў, якія злачынна бяздзейнічаюць адносна да выкананьня пляну вывазу бульбы. Прыцягнуты да адказнасьці **Лоеўскі, Старадароскі, Любаньскі, Чырвонаслабодзкі, Старобінскі, Асіпавіцкі, Чарэйскі, Юравіцкі раёны.**

Усякае зацягваньне вывазкі бульбы павінна разглядацца, як зрыў рабочага забесьпячэньня.

Райспажыўтаварыствам даны рэальныя заданьні, якія пры адпаведнай работе загатоўчых арганізацый могуць быць поўнасьцю выкананы. **А.**

Уборка скончана

ЛАГОЙСК. (Па тэлефону).

На 22 кастрычніка ў Лагойскім раёне 19 калгасаў скончылі ўборку бульбы, у трох калгасах засталося ўбраць 30 га, што складае 7,9 проц. іх плошчы. Па саўгасах раёну з 203 га бульбы ня ўбрана 35 га.

42 проц. гадавога пляну

КАСТРЫЧНІК НЯ ДАЎ ЯШЧЭ ПЕРАЛОМУ Ў ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ

Раўняйцеся па калгасах Дрысенскага і Сіроцінскага раёнаў, якія перавыканалі заданьне ўдвая

Рашаючыя дні

«Зьвязда» ў перадавым артыкуле ад 19 кастрычніка канстатавала, што ход збожжазагатовак па БССР нездавальняючы, што крывая загатовак зьніжаецца з пяцідневкі ў пяцідневку: ад 14,4 проц. за першую пяцідневку, да 12,5 проц. за другую, да 12,3 проц. за трэцюю.

Даныя за чацьвертую пяцідневку кастрычніка сыгналізуюць, што гэты аналіз застаецца верным і зараз—тэмпы загатовак збожжа не павялічваюцца: чацьвертая пяцідневка дае толькі 12,6 проц. месячнага пляну. Яна паказвае, што большасьць раёнаў ня ўлічыла ўрокаў першых дзесяцідневак і ня ўжыла мер, каб забясьпечыць пералом у ходзе кампаніі.

Як і раней, выключна дрэнна здаюць збожжа саўгасы, адстаюць калгасы.

Калгасы Дрысенскага раёну выканалі 216 проц. пляну, Сіроцінскага — 194 проц.; калгасы Барысаўскага раёну выканалі 4 проц. заданьня; Расонскага—5 проц.

Чым тлумачыць такую вялікую розьніцу? «Якія аб'ектыўныя прычыны» паставілі дрысенскіх і сіроцінскіх калгасьнікаў у першыя рады здатчыкаў, а барысаўцаў прымусілі прасьцірэ ў хвасьце? Ніякіх «аб'ектыўных прычын» няма. Ёсьць няўменьне, нежаданьне працаваць бальшавіцкімі тэмпамі.

Там, дзе партыкіраўніцтва не разьлічвае на самацёк, дзе правільна арганізавана праца ў калгасах, дзе вядзецца барацьба з кулацкім уплывам,—там мы маем перавыкананьне пляну, там мы маем правільныя ўзаемаадносіны калгасьнікаў і адзінаасобнікаў, якія забясьпечваюць нарастаньне калгаснай хвалі.

У тых раёнах, дзе пануе курс на самацёк, дзе моцныя праваапартуністычныя настрої, дзе патураюць кулацкаму сабатажу, дзе не арганізаваны адпор кулацкай агітацыі—там наглядаюцца рэакцыя настрої нават і ў пасобных калгасах, сьвядомае паменшаньне пішкаў, там калгасы парушаюць свой абавязак перад дзяржавай.

Да канца кастрычніка засталася адна пяцідневка. У гэты кароткі тэрмін трэба дабіцца самага рашучага пералому на збожжазагатоўчым фронце.

Для гэтага трэба рашуча пакончыць з расхлябанасьцю, бязьлітосна змагацца з праваапартуністычнай стаўкай на самацёк, праверыць выкананьне цьвёрдых заданьняў кулакамі, штрафуючы і аддаючы пад суд сабатажнікаў і спэкулянтаў; праверыць здачу збожжа паводле кантрактацыйных дагавароў. Збожжазагатоўкі павінны быць цесна ўвязаны з усёй асеньняй с.-г. кампаніяй і падпарадкаваны задачам далейшага ўздыму калектывізацыі.

Калгасы павінны ў самы бліжэйшы тэрмін выканаць пляны загатовак, паказаўшы прыклад перадавікоў збожжазагатовак.

Бліжэйшыя дні зьяўляюцца рашаючымі для посьпеху важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі збожжазагатовак.

КРЫВАЯ ЗАГАТОВАК ЗЬНІЖАЕЦЦА

4-ая пяцідневка кастрычніка паказвае, што пералому ў загатоўчай рабоце няма і што прарыў, які мы мелі з пачатку кастрычніка, яшчэ не ліквідаваны.

За час з 15 па 20 кастрычніка загатоўлена 6.284 тоны, што складае 12,6 проц. месячнага заданьня. Усяго месячны плян на 20 кастрычніка выкананы на 51,8 проц., а гадавы на 42 проц.

Ганебна, як і раней, адстаюць **саўгасы**, якія за гэту пяцідневку здалі толькі 10 тон збожжа, ці 0,9 проц. месячнага заданьня. Усяго саўгасамі гадавое заданьне выканана на 15,1 проц. За апошнюю пяцідневку саўгасамі загатоўлена ў пяць раз менш збожжа, чым у папярэднюю.

Адстаюць у выкананьні плянаў **калгасы.** За апошнюю пяцідневку калгасамі здана 431 тона, ці 2,9 проц. месячнага пляну. Наогул, калгасы на працягу кастрычніка значна зьнізілі тэмпы здачы збожжа. Так, па 20 кастрычніка калгасы выканалі 16,9 проц. месячнага заданьня, замест мінімальна патрэбных 80 проц.

Па **індывідуальным сэктары** за пяцідневку здана 5.132 тоны або 21,8 проц. месячнага заданьня. Усяго на 20 кастрычніка месячнае заданьне выканана індывідуальным сэктарам на 85,1 проц.

У тых раёнах, дзе цьвёрдыя заданьні кулакам дадзены, спагнаньне збожжа праходзіць вельмі марудна. Так, па 30-ці раёнах, аб якіх у Наркамгандлю ёсьць весткі, замест 5.117 тон, якія павінны былі паступіць па цьвёрдых заданьнях, на 15 кастрычніка кулакамі здадзена толькі 2,606 тон, ці 50,8 проц.

ДА КАСТРЫЧНІЦКІХ СЬВЯТ

Калгасы павінны скончыць здачу збожжа

З боку паасобных раёнаў наглядаецца недаацэнка значэньня здачы збожжа калгасамі.

Некаторыя работнікі райкалгассаюзу падпяваюць правым апартуністым, кажучы, што калгасны хлеб нікуды ня ўцячэ. Яны забываюць, што калгасны сэктар павінен быць першым па выкананьні пляну збожжазагатовак, паказваць прыклад адзінаасобнікам.

У той час, як плян збожжазагатовак у сярэднім па БССР выкананы на 42 проц., калгасы выканалі сваё заданьне толькі на 32 проц.

Асабліва адстаюць у загатоўках калгасы **Барысаўскага** раёну, якія выканалі толькі 4 проц. гадавога заданьня, **Расонскага** — 5 проц., **Чэрвеньскага**—6 проц., **Жыткавіцкага**—6 проц. і г. д.

Побач з гэтым ёсьць раёны, якія здолелі паказаць прыклады ўзорнага правядзеньня збожжазагатовак: **Дрысенскі** раён выканаў гадавое заданьне на 216 проц., **Сіроцінскі** — 194 проц., **Вушацкі**—194 проц., **Дрыбінскі**—186 проц. і г. д.

За неправядзеньне адпаведнай растлумачальнай работы і непрыняцьце патрэбных арганізацыйных мер для своечасовага выкананьня калгасамі пляну збожжазагатовак, праўленьне Калгасцэнтру абвясьціла вымову з апублікаваньнем у друку праўленьням **Расонскага, Жыткавіцкага, Чэрвеньскага і Барысаўскага райкалгассаюзаў.**

Калгасцэнтр катэгарычна прапанаваў **райкалгассаюзам і праўленьням калгасаў—выканаць плян здачы таварных лішкаў калгасаў—не назьней Кастрычніцкіх сьвят.**

А.

Вінаватых—да адказнасьці

ГЛУСК. (Наш кар.). Слаба, вельмі слаба ідуць па раёне загатоўкі гародніны. Райкаапсаюз і спажывецкая каапэрацыя недаацэнілі значэньня загатовак.

Райкаапсаюз павінен быў загатовіць 90 тон капусты, загатоўлена 25,5; замест 90 тон яблык загатоўлена—3,4.

Спажывецкая каапэрацыя загатовіла 5 тон капусты, замест 75, адну тону яблык, замест 30.

Раённая РСІ пастанавіла перадаць справу аб зрыве загатовак гародніны сьледчым органам для прыцягненьня вінаватых да судовай адказнасьці.

Дзе—І.

Ударнікі бульбазагатовак

Чырвоны абоз з 250 фурманкамі бульбы

ЛЮБАНЬ. БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ ВЕСКІ ТАЛЬ АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ ПА ЗАГАТОЎКАХ БУЛЬБЫ, АРГАНІЗАВАЛІ ЧЫРВОНЫ АБОЗ У КОЛЬКАСЬЦІ 250 ФУРМАНАК, АБОЗ ВЫЕХАЎ НА СТАНЦЫЮ УРЭЧЧА.

ПЕРАД АДПРАЎКАЙ АБОЗУ АДБЫЛСЯ МІТЫНГ, НА ЯКІМ ПРАЦОЎНАЕ СЯЛЯНСТВА ВЕСКІ АБЯЦАЛА ДА 13-Я ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН, НЕЛЬГА НЕ АДЗНАЧЫЦЬ, ШТО БЕДНЯКІ, ЯКІЯ НЯ МЕЛІ СВАЕЙ БУЛЬБЫ, ДАПАМАГАЛІ КАЛГАСУ ВЕСКІ ТАЛЬ ГРУЗІЦЬ БУЛЬБУ ДЛЯ АДПРАЎКІ.

КАСТРЫЧНІК—УДАРНЫ МЕСЯЦ БУДАЎНІЦТВА СЬВІНАРНІКАЎ

Мабілізаваць грамадзкасьць сьвінаводных саўгасаў і калгасаў вакол выкананьня пляну сьвінагадоўлі

Першы ўзнос у мясны фонд

РЭСПУБЛІКІ

Саўгасы трэсту „Сьвінавод" здаюць дзяржаве 507 адкормленых сьвіней

27 САЎГАСАЎ ТРЭСТУ «СЬВІНАВОД» РОБЯЦЬ ПЕРШЫ ЎЗНОС У МЯСНЫ ФОНД РЭСПУБЛІКІ. ДА 13-Е ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ САЎГАСЫ ЗДАЮЦЬ 507 АДКОРМЛЕНЫХ СЬВІНЕЙ.

САЎГАС **«БАБІНІЧЫ»** (АРШАНСКІ РАЁН) ЗДАЕ 100 ГАЛОЎ; САЎГАС **«ХАЛОЎЕ»** (ДУБРОВЕНСКІ РАЁН)—40 ГАЛОЎ, **«МСЬЦІЖ»** (БЯГОМЛЬСКІ РАЁН)—50 ГАЛОЎ, **«ВІЛЕНСІНЧА»** (ПУХАВІЦКІ РАЁН)—45 ГАЛОЎ, **«ШЫКАТОВІЧЫ»** (САМАХВАЛАВІЦКІ РАЁН)—30 ГАЛОЎ, **«НАСОВІЧЫ»** (ГОМЕЛЬСКІ РАЁН)—30 ГАЛОЎ, **«ЛЕМНІЦА»** (КОХАНАЎСКІ РАЁН)—23 ГАЛОВЫ, **«ЛУЧЫЦА»** (БЫХАЎСКІ РАЁН)—20 ГАЛОЎ, **«АНТАНОПАЛЬ»** (СМАЛЯВІЦКІ РАЁН)—17 ГАЛОЎ, **«БОРКІ-БЯЛЕВІЧЫ»** (КРАСНА-СЛАБОДЗКІ РАЁН) — 15 ГАЛОЎ, **«БАНОН»** (ВЕТРЫНСКІ РАЁН — 15 ГАЛОЎ, **«ВІШНЁЎКА** (АСТРАШЫЦКА-ГАРАДЗЕЦКІ РАЁН)—16 ГАЛОЎ, **«ЯЛАВА-ПАЎЛАВА»** (ЧАЎСКІ РАЁН)—15 ГАЛОЎ.

САЎГАСЫ **«СЯЛЕЦ»** (ЗАСЛАЎСКІ РАЁН), **«ГОРКІ-АБЧАК»** (СЬМІЛАВІЦКІ РАЁН), **«ЛУЦЯЎШЧЫНА»** (ЛАГОЙСКІ РАЁН), **«ПАШКОВА»** (БАГУШЭЎСКІ), **«ХАРОМЦЫ»** (ГЛУСКІ), **«СТАРЧЫЦЫ»** (СЛУЦКІ), **«ЦЫМАНАВА»** (КЛІМАВІЦКІ), **«БАЧЭЙКАВА»** (БЕШАНКОВІЦКІ), **«НЕГАРЭЛАЕ»** (КОЙДАНАЎСКІ), **«ВЫСОКАЕ»** (КАСЬЦЮКОВІЦКІ), **«НЕКРАШЫ»** І **«БРАНЧЫЦЫ»** (СЛУЦКІ РАЁН), **«ДРЫБІН»** (ДРЫБІНСКІ), **«ВУСЬЦЕ»** (АРШАНСКІ)—ЗДАЮЦЬ КОЖНЫ АД 5 ДА 10 ГАЛОЎ.

Шукаюць апраўданьняў

сваёй бязьдзейнасьці

Па Касьцюковіцкім раёне было вызначана пабудаваць да 1-га кастрычніка 8 сьвінарнікаў і паставіць 600 сьвінаматак. Гэты плян, бязумоўна, ажыцьцявімы. Між тым будаўнічая праграма выканана ўсяго ў разьмеры 50 проц. Сьвінаматак пастаўлена 472.

Раённыя работнікі ўвесь час шукалі розных «аб'ектыўных» прычын, каб апраўдаць сваю бязьдзейнасьць. Старшыня Касьцюковіцкага райкалгассаюзу спасылаўся на тое, што Белкалгасцэнтр ня выслаў тэхніка. Некаторыя старшыні калгасаў марудныя тэмпы будаўніцтва тлумачаць тым, што цэсьляром не даюць прэмій.

Так у спрэчках прайшоў амаль увесь будаўнічы сэзон. Раённыя-ж работнікі нічога не зрабілі, каб мабілізаваць на будаўніцтва сьвінарнікаў цэсьляроў-камсамольцаў. Ня ўлічаны таксама і цэсьляры ў саміх калгасах. Раённая КК РСІ павінна зараз высьвятліць сапраўдныя прычыны зрыву будаўніцтва.

Шчорбакоў.

Нядобраякаснасьць супроцьчумных прышчэпак

За апошні час у радзе саўгасаў трэсту «Сьвінавод» былі выпадкі падзяжу сьвіней пасьля супроцьчумных прышчэпак. У той час, калі прышчэпкі павінны напярэджваць захворваньні сярод сьвіней, яны наадварот узмацнілі эпідэмію. Такія факты мелі месца ў саўгасах «Некрашы») Слуцкі раён), «Антанопаль» (Смалявіцкі раён), «Лучыца» (Быхаўскі раён), «Крывое» (Талачынскі раён) і Вішнёўка (Астрашыцка-Гарадзецкі раён).

Гэтыя факты сьведчаць аб дрэннай якасьці работы нашай вэтэрынарыі. Трэба зараз-жа праверыць работу В. Э. Т. П. О. (усесаюзнае вэтэрынарнае таварыства па барацьбе з эпізатыяй). Прышчэпачны матар'ял павінен быць неадкладна дасьледваны.

500 кароў патрабуюць месца

БАБРУЙСК. (Наш кар.).

На фэрме Бабруйскага ЦРК ёсьць звыш 500 кароў, якія ўвесь час трымаюцца пад адкрытым небам, пад дажджом. Удой іх значна зьменшыўся. Некаторыя пачалі хварэць. Да будаўніцтва кароўнікаў прыступлена толькі зараз, і то на 250 галоў. Дзе будзе знаходзіцца рэшта — невядома.

Ня лепш і становішча са сьвінарнікамі. Першае, што нам кінулася ў вочы, калі мы прышлі на сьвінарнік — гэта чалавек, які рэзаў парасё. Аказваецца, парасё утапілася ў бочцы з памыямі. Гэта ўжо ня першы выпадак. Сьвінаматкі трымаюцца разам з сьвіньнямі на адкорм, сьвінаматкі перакормлены.

Ня гледзячы на тое, што ў сьвінарніку праведзена электрычнасьць, там вельмі цёмна, бо адміністрацыя не паклапацілася, каб купіць лямпачкі за 40 кан. Догляд за сьвіньнямі велькмі дрэнны.

Белсельтрэст усё піша і піша...

Белсельтрэст упарта ігнаруе пастанову НК РСІ і ЭКАНА аб прыёмцы ад саўгасаў трэсту «Сьвінавод» 1.500 цялят. У радзе саўгасаў з-за адсутнасьці памяшканьняў цялаты знаходзяцца пад адкрытым небам. Сярод цялят панцыруюцца захворваньні. У саўгасах **«Антанопаль», «Луцаўшчына», «Банонь», «Бачэйкава», «Палялюм» наглядаюцца дзесяткі выпадкаў захворваньня цялят.**

Замест таго, каб прыступіць да практычнага прыёму цялят. Белсельтрэст усё яшчэ займаецца пісаньнем розных адносін і хадайніцтваў аб скасаваньні пастановы НК РСІ.

Мы лічым такое становішча недапушчальным. Трэба зараз-жа прыняць меры да разгрузкі саўгасаў трэсту «Сьвінавод» ад лішніх цялят. Белсельтрэст павінен выканаць дырэктывы вышэйшых органаў.

Да 7 лістапада зьвязаць усе школы з вытворчасьцю

Заводы і ф-кі, станавецеся ў першыя рады барацьбітоў за палітэхнізм

Школа павінна стаць ударным цэхам заводу

Мабілізаваць масы на барацьбу за палітэхнізацыю

Барацьба за палітэхнічную асьвету—ёсьць барацьба за далейшае пераможнае сацыялістычнае наступленьне, за забесьпячэньне сацыялістычнай прамысловасьці кваліфікаванымі кадрамі.

У пастановах XVI зьезду партыі вызначаны поўныя шляхі рэформы школы і, у першую чаргу, перабудовы ўсяе сыстэмы народнай асьветы з такім разьлікам, каб школа стала неадрыўнай часткай вытворчага працэсу. Гэтыя пастановы абавязваюць нас ліквідаваць вялізарны разрыў, які да апошняга часу існаваў і яшчэ існуе паміж вытворчасьцю і школамі, наблізіць школу да заводу і завод да школы—адна з баявых чарговых, неадкладных задач.

Палітэхнізм—справа новая. Яго трэба будаваць, але не такімі тэмпамі, якія ёсьць у нас на Беларусі. Мы адзначаем, што толькі адзінкавыя прадпрыемствы і школы зрабілі першыя кроні па шляху палітэхнізацыі і ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і пастаноў палітэхнічнага зьезду. Увогуле-ж няма пералому, няма патрэбных бальшавіцкіх тэмпаў перабудовы ўсяе сыстэмы асьветы. Прафсаюзныя арганізацыі, якія павінны быць застрэльшчыкамі ў правядзеньні палітэхнізацыі, вельмі часта стаяць у баку ад гэтай баявой задачы.

Адносіны ВСНГБ і раду трэстаў і аб'яднаньняў да палітэхнізацыі школы зьяўляюцца больш чым нецярпімымі. Зусім нядаўна на палітэхнічным зьезьдзе прадстаўнікі ВСНГБ запэўнялі саўецкую грамадзкасьць, што ВСНГ зробіць усё неабходнае і мажлівае па ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі аб палітэхнізацыі. Але пачаўся навучальны год і ВСНГ зьмяніў свае ранейшыя погляды. Так, школа імя Чарвякова засталася бяспрытульнай, ад яе адмовіліся Скураб'яднаньне і ВСНГ.

Гэты факт з усёй выразнасьцю сьведчыць аб тым, што рад цэнтральных устаноў літаральна нічога не зрабіў, каб садзейнічаць наўхільнаму выкананьню пастаноў палітэхнічнага зьезду.

Мы лічым, што ў справе выкананьня дырэктыў партыі па палітэхнізацыі патрэбен рашучы і неадкладны пералом. Ні адна партыйная ячэйка, фабзаўком не павінен заставацца ў баку ад барацьбы за палітэхнічную асьвету, ад барацьбы за кваліфікаваныя кадры для сацыялістычнай прамысловасьці.

ЗА КУЛІСАМІ ЎРАЧЫСТЫХ АБЯЦАНЬНЯЎ

ВСНГБ І СКУРАБ'ЯДНАНЬНЕ АДМОВІЛІСЯ ВЫКАНАЦЬ ЗАГАД АБ ПАЛІТЭХНІЗАЦЫІ

У лістопадзе месяцы пастановай НКА былі рэарганізаваны 8-9 групы школы імя Чарвякова (Менск) у хэмічную прафшколу. Інспэктар НКА **Жыгмунт** наведамляе школу, што яна перадаецца ў веданьне **ВСНГБ.** На падставе гэтага школа робіць прыём паводле правіл прыёму ў прафшколы і пачынае перагаворы з ВСНГ адносна перадачы, афармленьня і г. д. З перагавораў высьвятлялася, што ВСНГ нічога ня ведае аб перадачы школы. ВСНГ праз некалькі дзён катэгарычна адмаўляецца прыняць 8 і 9 групы школы.

Па сутнасьці гэта адмаўленьне азначала адмаўленьнем ВСНГ ад арганізацыі хэмічнае прафшколы.

У пачатку верасьня, на пасяджэньні Дзяржпляну прадстаўнік ВСНГ тав. **Табайнік** дае згоду прыняць 6 трэціх канцэнтраў школ, у тым ліку трэці канцэнтр школы імя Чарвякова. ВСНГ згаджаецца з пастановай Дзяржпляну і прымае школы ў сваю сетку, мабыць для таго, каб зрабіць прыгожы гэст першаму ўсебеларускаму палітэхнічнаму зьезду. Моў, мы таксама за палітэхнізацыю. Але словы і справа ВСНГ — дзьве розныя рэчы. 15 верасьня аддзел кадраў ВСНГ загадвае аб'яднаньням і трэстам аформіць перадачу — прыём трэціх канцэнтраў школ.

Пачынаюцца спрэчкі, гутаркі, цяганіна з аб'яднаньнямі, бо аб'яднаньне Скурсындыкат, якому былі перададзены 8 і 9 групы школы імя Чарвякова, катэгарычна адмовіўся выканаць пастанову Дзяржпляну і загад ВСНГ. Аб'яднаньне толькі праз месяц наведамляе ВСНГ аб сваёй адмове. Аддзел кадраў ВСНГ на працягу больш 2-х тыдняў запэўняў НКА, што ён (аддзел кадраў) прымусіць Скураб'яднаньне выканаць пастанову Дзяржпляну — прыняць 8 і 9 групы школ. Прайшло яшчэ некалькі дзён і ВСНГ пакорліва згадзіўся са Скураб'яднаньнем. Больш таго, ВСНГ адрокся ад школы, ад сваёй згоды, якую ён даў Дзяржпляну вуснамі тав. Табайніка.

Школа пачала работу 15 кастрычніка. Зараз вывяліся, што школа засталася без гаспадара. Дзяржбюджэт ужо складзены і школа ні па ВСНГ, ні па НКА ў бюджэт ня ўключана. У НКА лічаць, што школа павінна быць унесена ў бюджэт Менскага тарсавету, у той час, як школа мае рэспубліканскае значэньне і рыхтуе кадры для рэспубліканскай прамысловасьці. Гарсавет згадзіўся ўзяць школу на свой каштарыс **умоўна,**

Атрымалася так, што школа на працягу 50 дзён працавала умоўна (?). **ВСНГ, НКА, Скураб'яднаньне** кідаліся школай, як футбольным мячом, пакуль школа не апынулася ва ўмовах «умоўнай». У сувязі з адсутнасьцю сродкаў, да гэтага часу не пабудаваны лябараторыі колькаснага і якаснага аналізу, без якіх літаральна немагчыма разгарнуць работу.

НКА і ВСНГ на працягу 50 дзён не зрабілі нічога, каб вызначыць **спэцыяльныя ўхілы і ўстанавіць каго павінна рыхтаваць прафшкола і для якой галіны прамысловасьці.** Такое становішча прыводзіць да зрыву навучальнага году... Школа працуе бяз пляну. Прафшкольцы (выключна рабочыя і калгасьнікі), ня будучы забясьпечанымі стыпэндыяй, жыльлём, бачачы поўную адсутнасьць патрэбнага абсталяваньня, праз месяц работы сталі пакідаць школу. Пакінула школу 16 асоб, найбольш сацыяльна каштоўных. Рэшта падтрымліваецца камсодам сямігодкі.

Ня гледзячы на тое, што цэнтральныя газэты, у тым ліку і «Зьвязда» ўжо ня раз патрабавалі ад адпаведных органаў пакласьці канец бюракратычным зьдзекам са школы і прыцягнуць да адказнасьці людзей, якія зрываюць выкананьне задач па разгортваньні палітэхнічнай асьветы. Такое-ж становішча з хэмічнымі прафшколамі па ўсёй Беларусі. Усе яны знаходзяцца на правох пасынкаў.

Лічым, што такія адносіны з боку ВСНГ да хэмічных прафшкол, да палітэхнізацыі зьяўляюцца зусім нецярпімымі.

Ш.

Разгарнулі работу

Аршанская чыгуначная сямігодка зрабіла першыя крокі на шляху палітэхнізацыі. **МК 2** узяў шэфства над школай, вылучыў спэцыяльную брыгаду па дапамозе школе, ў ажыцьцяўленьні пастановы палітэхнічнага зьезду. Пры школе арганізавана майстэрня для вучняў. Брыгадай для майстэрні ўжо сабрана частка патрэбных інструментаў.

Пытаньне палітэхнізацыі шырока абгаварвалася на сходах рабочых, вучняў і настаўнікаў. Вучні старэйшых груп прымацаваны да школы вучнёўства, дзе яны праходзяць практыку.

Арганізаваны двухмесячныя курсы настаўнікаў па палітэхнізму, якія ўжо распачалі работу.

Школа павінна замацаваць першыя посьпехі з тым, каб разгарнуць яшчэ больш інтэнсыўную работу па выкананьні асноўных задач палітэхнічнай асьветы.

Шпак.

Чакаюць дырэктыў

У **Магілеве** да ажыцьцяўленьня пастаноў першага ўсебеларускага палітэхнічнага зьезду адносіліся фармальна. Школы прымацаваны да заводаў і фабрык, але канкрэтных вынікаў гэтага прымацаваньня да сёньняшняга дня няма. **Фабзаўкомы і партыйныя ячэйкі** літаральна нічога не зрабілі, каб азнаёміць рабочых з дырэктывамі партыі і ўраду аб палітэхнізацыі.

На гарбарні імя Сталіна, як і на радзе іншых прадпрыемстваў, кіраўнікі нават зусім адмаўляюцца гаварыць аб палітэхнізацыі, спасылаючыся на тое, што ад ВСНГБ не атрыманы адпаведныя дырэктывы (?).

Такія адносіны з боку адміністрацы

Заводы чакаюць пісьменьнікаў...

АРГАНІЗАЦЫЯ ЛІТГУРТКОЎ ПРАХОДЗІЦЬ МАРУДНА

Паасобных белапаўцаў не датычыць лёзунг „Тварам да вытворчасьці"

27 кастрычніка ў Доме пісьменьніка адбыўся агульны сход Менскай філіі БелАПП'у, на якім былі заслуханы справаздачы таварышоў, адказных за арганізацыю літаратурных гурткоў на канных прадпрыемствах.

Сход адкрыўся прамовай сакратара філіі т. Іл. Барашкі. У сваёй прамове т. Барашка адзначыў, што частка членаў БелАПП'у на сёньняшні дзень яшчэ не давялі дысцыплінована, што тыя, які іншыя таварышы часамі зусім адмаўляюцца ісьці на завод, кажучы:

— Нам няма часу: калі-ж тварыць загадаеце? Няма калі лётаць па прадпрыемствах...

Сапраўды. Вельмі малы лік прысутных, паўнасьцю усяго трацце часткі белапаўцаў, што павінны былі рабіць справаздачу аб праробленым, безініцыятыўнасьць і абыкавасьць — усё гэта выразна сьведчыць аб поўным прарыве. БелАПП яшчэ не перабудаваў свае рады, не ачысьціўся ад лішняга балясту...

З справаздач выявілася, што імкненьні да літаратурнае творчасьці сярод рабочых мас — нярэдкі, што паасобныя рабочыя сур'ёзна цікавяцца пытаньнямі разьвіцьця беларускае пралетарскае літаратуры. А між тым толькі 5-6 брыгадзіраў адолелі дагэтуль (ня кледзячы на выстарчальны тэрмін — **больш 10 дзён**) стварыць крытычна-творчыя гурткі на фабрыках і заводах, зарэгістраваць рабкораў, наладзіць рэгулярны выпуск насьценных газэт.

Больш-менш дакладныя выцікі дзейнасьці белапаўцаў ёсьць на **«Энэргіі», майстэрнях Белдзяржбуду, гуце «Пралетары», першай друкарні.**

«У зборамі» бязьдзейнасьці могуць служыць т. т. **Хадыка, Моркаўка, Астапенка, Шалай, Таўбін** і інш. Чаго варта, напрыклад, такое зьявішча, калі з «Камунару» некалькі разоў на дзень звоняць па тэлефону ў Дом пісьменьніка, выклікаюць белапаўскую брыгаду, брыгадзіры «ў бягох»?..

10 гурткоў па ўсім Менску — гэтага, бясспрэчна, мала. Трэба сказаць, што мы не дамагліся яшчэ дапамогі ад ЦСПСБ, які ня ў прыклад УсеЦСПС чамусьці лічыць гэтую справу нявартай сваёй увагі... Няма яшчэ і сталых, падрабязных праграм работы літгурткоў на бліжэйшы час.

Але галоўнае — гэта абураюча «напляваўцельскія» адносіны саміх белапаўцаў...

Агульны сход, адзначыўшы, што арганізацыя літгурткоў на прадпрыемствах ідзе слабымі тэмпамі, прапанаваў бюро філіі ўжыць рашучыя захады да «дэзэртыраў», да тых, хто ўхіляецца ад важнейшае грамадзкае нагрузкі на асацыяцыі. Ухвалена таксама выклікаць беларускіх мастакоў на актыўны ўдзел у масавай рабоце БелАПП'у.

Пры Менскай філіі будзе створаны штаб кіраўніцтва, у які ўвойдуць прадстаўнікі райкому КП(б)Б, ЛКСМБ і культсэктару ЦСПСБ.

У склад бюро філіі на ўзмацненьне гэтае работы каптаваны таварышы **Бобрык і Ліхадзееўскі.** Створаньне літаратурных гурткоў будзе скончана да кастрычніцкіх сьвят.

Пры дружнай рабоце, у поўнай сьвядомасьці таго, што член БелАПП'у ня можа быць адарваны ад прадпрыемства, у ведамі кожным белапаўцам сваіх адказных абавязкаў, асацыяцыя сапраўды перабудуецца, адпаведна задачам рэканструкцыйнага перыяду. А патрэбнасьць у гэтай перабудове даўно насьпела.

Юр. Лявонны.

За савецкае дырыжаблябудаўніцтва

Уносяць і выклікаюць

Калгасы Жлобінскага раёну ўносяць у фонд пабудовы дырыжабля «Калгаснік» 450 руб. і выклікаюць пасьледнядзь іх прыкладу калгасы Рагачоўскага раёну.

* * *

Агульны сход рабочых саўгасу імя Карла Лібкнехта сумесна з чырвонаармейскай брыгадай уносіць на пабудову дырыжабля газэты «Правда» 196 руб. 45 кап. і выклікаюць арабіць тое самае калгасы і саўгасы Заслаўскага раёну.

* * *

Тав. Лацыс, прымаючы выклік т. Нядбазанскага, уносіць 5 руб. у фонд пабудовы дырыжабля імя «Правды» і выклікае раённых работнікаў ільнаканапляводнай кампаніі.

* * *

Ячэйка Асоавіяхіму 1-й арцелі інвалідаў унесла на пабудову дырыжабля імя газэты «Правда» 35 руб.

* * *

Ячэйка Асоавіяхіму цэху «Д» аб'ядванай прафтэхшколы (Менск) адлічыла ў фонд пабудовы дырыжабля «Асоавіяхім» 40 руб. 25 кап. і выклікае астатнія цэхавыя ячэйкі школы.

* * *

Чыгірынская ячэйка КП(б)Б, Чачэвіцкага раёну сабрала 36 руб. у фонд савецкага дырыжаблябудаўніцтва і выклікае Чачэвіцкую і Збышынскую парт ячэйкі.

— Збышынская ячэйка ў адказ на выклік сабрала 100 руб. і ў сваю чаргу выклікае Даўгынскую і ячэйку КП(б)Б камуны імя Карла Маркса.

* * *

Рабочы і служачыя 1-й часьці пажарнай аховы ў ліку 85 чал. адлічылі ў фонд савецкага дыржаблябудаўніцтва 148 руб.; 2-я часьць пажарнай аховы — 1 проц. месячнага заработку; камінатрэрад унёс 20 р.; рабочыя-кампары т.т. **Ляўкоў і Грыб адлічваюць 1% месячнага заработку на працягу году.**

* * *

Калектыў студэнтаў і настаўнікаў сельска-гаспадарчага тэхнікуму ў Стара-Барысаве адлічыў у фонд дырыжабля «Правды» 60 руб. 58 кап.

* * *

Студэнты факультэту народнай гаспадаркі БДУ уносяць на пабудову дырыжабля імя газэты «Правда» 150 руб. і выклікаюць пасьледнядзь іх прыкладу студэнтаў астатніх ф-таў БДУ.

* * *

Тав. Розэнбэрг уносіць 3 руб. на пабудову дырыжабля «Правды» і выклікае інструктароў вучэбна-вытворчых майстэрань Офштейна і Маленковіча.

— Тав. Офштэйн прымае выклік і ўносіць аблігацыямі 3-й назыкі 25 руб.

— Тав. Маленковіч, прымаючы выклік т. Розэнбэрга, адлічыў у фонд дыржаблябудаўніцтва аблігацыямі 15 р. і 15 руб. у карысьць МОПР'у і выклікае наступных т.т.: Зельцэра (хлебазавод), Сялькоўскага (старшыня арцелі «Чырвоны Металісты»), Каждана («Чырвоны Металісты»), Левітан («Чырв. Металісты»), Зісіна У., Юдзелевіча, Лямэрта, Шарыка, Фэйгельман (24-я школа).

* * *

Удзельнікі партнарады Зэмбінскай ячэйкі КП(б)Б сабралі і ўнесьлі 25 руб. у фонд дырыжабля «Правды».

* * *

Калгас «1-я мая» (Гарадзецкі сельсавет, Быхаўскага раёну) уносіць на пабудову дырыжабля «Калгаснік» 58 руб. і выклікае калгас «Новае жыцьцё».

* * *

Работнікі Караліністкага райвыканкому, у ліку 20 асоб, уносяць 31 руб. у фонд дырыжаблябудаўніцтва і выклікаюць арабіць тое самае работнікаў Караліністкага леспрамгасу, спажывецкага т-ва, райкаапсаюзу, а таксама Мазырскі і Нараўлянскі райвыканкомы.

Чаму арганізуецца Беларускі рэчны флёт

XVI партзьезд даў рэзка адмоўную ацэнку работы рачнога транспарту.

Вялікі адрыў транспарту ад народнай гаспадаркі, барбарскія спосабы эксплёатацыі флёту, бюракратычная сыстэма кіраўніцтва, слабая рацыяналізацыя рачнога транспарту прывялі да таго, што наш водны транспарт стаў «вузкім месцам» у народнай гаспадарцы СССР.

У параўнаньні з даваенным часам роля воднага транспарту значна зьнізілася. Калі ў 1913 г. ўдзельная вага яго ў перавозках раўнялася 36,2 проц., дык у 1930 годзе яна раўняецца толькі 23 проц. У той час, калі ўсе галіны народнай гаспадаркі даўно перайшлі за даваенныя межы, рачному транспарту прыходзіцца толькі імкнуцца да гэтага.

Усесаюзнае аб'яднаньне рачнога транспарту паставіла сваёй першачарговай задачай ліквідаваць прарывы ў рабоце рачнога флёту пастаўць рачны транспарт у агульную шарэнгу перадавікоў сацыялістычнай будоўлі.

Адным з практычных мерапрыемстваў да выраўнаньня гэтай задачы зьяўляецца наближэньне транспарту да раёнаў, дэцэнтралізацыя, рэарганізацыя сыстэмы кіраўніцтва водным транспартам. Замест 11 буйных пароходстваў будзе арганізавана 25 кіраўніцтваў дзяржаўнага рачнога флёту.

У прыватнасьці, арганізуецца кіраўніцтва Беларускага дзяржаўнага рачнога флёту, якое будзе абслугоўваць басэйны Зах. Дзьвіны, Бярэзіны, Бярэзінскай сыстэмы, Дняпра ад вярхоўя да Лоева і р. Сожа. Кіраўніцтва Беларускага дзяржаўнага пароходства будзе знаходзіцца ў г. Магілеве.

Плянавыя органы БССР павінны сур'ёзна прапрацаваць пытаньні грузапатокаў і эканомікі раёнаў, якія прылягаюць да Дняпра і Сожу. Да абгаварэньня праекту рэарганізацыі трэба прыцягнуць шырокія масы работнікаў рачнога транспарту.

А. С. ІНСАРАЎ.

У „дэкаду абароны" праверым становішча шэфскай работы

Шэфства — на новыя рэйкі ўзаемнай вытворчай дапамогі



РАБОТНІЦЫ ВЫВУЧАЮЦЬ КУЛЯМЕТ

Шэфства — на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады

Адозва ЦК УсеКП(б), якая выклікала начуваны ўздым рэвалюцыйнага энтузіязму рабочае клясы на правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі, на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, відавочна паказала нам якія вялізарныя вынікі можа даць мабілізацыя энэргіі рабочай клясы на вырашэньне задач, што стаяць перад краінай.

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, грамадзкі буксір, «сквозные» брыгады, паток рабочых прапаноў і вынаходніцтва, вытворчыя манэўры — усе гэтыя новыя формы калектыўнае працы ўзьнімалі шырокія масы рабочых у бой за кантрольныя лічбы, за прамфінплян, за выкананьне пастаноў XVI партзьезду.

Рабоча-сялянская Чырвоная армія не змагла застацца ў баку ад гэтага магутнага патоку рэвалюцыйнага энтузіязму.

Спаборніцтва разьдзелаў, рот і палкоў, індывідуальнае ўдарніцтва, паток чырвонаармейскіх прапаноў і вынаходніцтваў, зьлёты ўдарнікаў, грамадзкі буксір, «сквозные» брыгады — усё гэта ўзьняло на вялікую вышыню баявую падрыхтоўку часьцей Чырвонай арміі.

Аднак, часьці Чырвонай арміі гэтым вялізарнейшым дасягненьнем у сваёй баявой рабоце не абмежавалася. Адозва ЦК УсеКП(б) не прайшла міма ўвагі бойцоў і побач з павышэньнем сваёй баявой магутнасьці, часьці Чырвонай арміі шчыльна падыйшлі да пытаньня аказаньня практычнай дапамогі ў справе выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну на фабрыках і заводах, калгасах і саўгасах.

— САМАЕ ГАЛОЎНАЕ Ў СПАБОРНІЦТВЕ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ,— гаворыць у сваім дакладзе на XVI партзьезьдзе т. Сталін, — ШТО ЯНО РОБІЦЬ КАРЭННЫ ПЕРАВАРОТ У ПОГЛЯДАХ ЛЮДЗЕЙ НА ПРАЦУ. Гэты карэнны пераварот ужо адбыўся і ў арміі. Вялізарнейшая маса чырвонаармейцаў ужо іншымі вачыма глядзіць на тую фабрыку і завод, на той калгас і саўгас, над якім шэфствуе чырвонаармейская часьць.

Шэфства ў чырвонаармейцаў пераключаецца на больш вышэйшую ступень, чым яно было раней. Калі раней шэфства заключалася толькі ва ўзаемным удзеле на ўрачыстых вечарох, дык зараз шэфства пачынае пераходзіць на іншыя рэйкі, на рэйкі вытворчай дапамогі адзін аднаму.

Мы маем тысячы заключаных сацыялістычных дагавораў паміж часьцямі і прадпрыемствамі і самае галоўнае гэта тое, што мы зьяўляемся сьведкамі таго, як чырвонаармейцы з вялікім энтузіязмам дапамагаюць прадпрыемствам выканаць свае кантрольныя лічбы.

Сотні суботнікаў на фабрыках і заводах, тысячы рабочых рук на палёх саўгасаў і калгасаў, дзесяткі тысяч тон убранага ўраджаю, сотні груженых вагонаў — вось практычная дапамога падшэфных часьцей.

Прарыў на абутковай фабрыцы — падшэфная часьць бярэ на буксір фабрыку і дапамагае рабочым выканаць свой прамфінплян.

Далёка адсталі на «Камінтэрне» з падпіскай на пазыку і байцы падшэфнай часьці бяруць на буксір дрэваапрацоўшчыкаў, дапамагаюць разгарнуць падпіску і тым самым дапамагаюць рабочым выканаць свой доўг перад краінай.

Прыехала група экскурсантаў-чырвонаармейцаў на Асінбуд. Агледзела будаўніцтва, а тут суботнік у рабочых Асінбуду. Засталіся яшчэ на дзень і ў выніку: «ЗАРАЖАНЫЯ ПРЫКЛАДАМ РАБОЧЫХ АСІНБУДУ, ЭКСКУРСАНТЫ-ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ ПРАПАНАВАЛІ СВАЕ ПАСЛУГІ. ЯНЫ БЫЛІ ВЫКАРЫСТАНЫ НА ЗЯМЛЯНЫХ РАБОТАХ, ПАКАЗАЎШЫ ВЫСОКУЮ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ І НАДЗВЫЧАЙ СУМЛЕННЫЯ АДНОСІНЫ ДА СПРАВЫ.

АСІНБУД ЛІЧЫЦЬ НЕАБХОДНЫМ АДЗНАЧЫЦЬ САПРАЎДЫ ПРАЛЕТАРСКУЮ ДАПАМОГУ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ І ВЫКАЗВАЕ ІМ АСАБЛІВУЮ ЎДЗЯЧНАСЬЦЬ ЗА ГЭТУ ДАПАМОГУ.

НАЧАЛЬНІК БУДАЎНІЦТВА І ГАЛОЎНЫ ІНЖЫНЭР АЛЕЙНІКАЎ».

Бяруцца на буксір саўгасы, пасылаюцца брыгады ў калгасы — ПЕРАКЛЮЧАЕЦЦА ШЭФСТВА НА РЭЙКІ ВЫТВОРЧАЙ ДАПАМОГІ.

Гэты новы эрух патрабуе ад партыйных і прафсыянальных органаў узмацненьня шэфскай работы. Трэба выкарыстаць падшэфныя часьці, больш знаёміць іх з вытворчасьцю, прыцягнуць да правядзеньня ўсіх важнейшых палітычных кампаній, браць рабочых на падшэфнае прадпрыемства з ліку дэмабілізаваных байцоў, дабіцца, каб падшэфная часьць была рухавіком у справе вялізарнага ўзаемнага выкананьня кантрольных лічбаў прамфінпляну і вучэбна-баявога пляну часьцей, сустракацца рабочым з байцамі, заражаць адзін аднаго рэвалюцыйным энтузіязмам на справу выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, XVI зьезду партыі.

Шэфская работа стаановіцца важным вучасткам работы. Не аддаваць ёй увагі — злачынна. Шэфская работа павінна быць перабудавана.

Сталінцы! За вамі слова

Нельга сказаць, што з вайсковай работай у друкарні імя Сталіна — кепска. Не, там адчуваецца работа, але цікава тое, што работа ідзе паміма ячэйкі Асоавіяхіму, работу вядзе партыйны калектыў.

Даводзі сказаць, што ў друкарні ўжо зьвыш году, як створана рота са сваімі камандзірамі з ліку начскладу запасу. Гэта рота, хаця рэдка, але займаецца, а летам на прадпрыемстве былі праведзены дзьве баявыя трывогі з выхадам у поле. Трывогі былі распрацаваны, не забылі нават заханіць з сабой каапэратыў, была арганізавана ахова прадпрыемства і запрасілі камандзіраў з падшэфнага палка.

Але гэтай работай кіруе бюро партколектыву праз свайго ваенорга. Як ня дзіўна, а ячэйка Асоавіяхіму не працуе.

Не працуе ячэйка таму, што на чале ячэйкі стаіць «актыўны» асоавіяхімавец Крэйнін, член былога акрсавету Асоавіяхіму, які ні разу ня быў на пасяджэньнях Акрсавету і ні разу не зрабіў у сябе на прадпрыемстве пасяджэньня бюро ячэйкі Асоавіяхіму.

ВАЗІН.

Мы ведаем сваіх падшэфнікаў

Трэба адзначыць ячэйку Менбуду, як адну з прыкладных у справе шэфства з вайсковымі часьцямі.

Зімой рэгулярна ў Менбудзе працавалі вайсковыя гурткі, дзе кіраўнікамі былі камандзіры з падшэфных рот. Тут часьцей, чым дзе-небудзь у другой ячэйцы, паладжваюцца супольныя сходы рабочых з чырвонаармейцамі.

Вялікую дапамогу аказалі рабочыя 6-му палку, абсталяваўшы клюб, дзе дармова працавала 50 чалавек рабочых. Калі вызучалі рабочых, дык многія з ахвотаю ішлі працаваць у полк.

— Сваім падшэфнікам хутка адрамантуем клюб, — гаварылі яны і сапраўды клюб быў адрамантаваны паўдарнаму.

Ня толькі на ўрачыстых сходах бываюць рабочыя ў сваіх падшэфнікаў, але і ў па-за школьны час рабочыя праводзяць гутаркі ў казарме, а на ўрачыстыя дні лепшым байцом-ударнікам рабочыя падносьць свае скромныя падарункі.

Менбудаўцы маюць два добра абсталяваныя вайсковыя габінэты, праводзілі заняткі на стрэльбе, летам правялі дзьве трывогі з добрай яўкай, выпісваюць пяць вайсковых газэт і маюць 400 членаў Асоавіяхіму.

Цяпер у сувязі з «дэкадай абароны» шэфскую работу трэба яшчэ лепш наладзіць, трэба хутка зьяўцца яўныя недахопы.

Віленскі.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

26 кастрычніка, а 6 гадз. увеч., у памяшк. клюбу металістых (Універпрэйну, Паралак дня: 1) Даклад ЦК ЛКСМБ (дакл. тав. Рындзіч). 2) Справаздача рэвіз. камісіі. 4) Вынікі гаспадарчага году і задачы камсамолу (дакл. т. Стракоўскі). 5) Выбары РК ЛКСМБ і рэвіз камісіі. 6) Выбары дэлегатаў на X зьезд ЛКСМБ. Ячэйкам, якія яшчэ не атрымалі мандатаў, тэрмінова атрымаць у РК ЛКСМБ.

СЁНЬНЯ:

— Пэдгабінэт. У 19 гад.—сход настаўнікаў 1-х груп. Прапрацоўка далейшай тэмы.

— У 19 гадз.—сход настаўнікаў нямецкай мовы. Справаздача і перавыбары бюро, план працы.

— Бюро фізкультуры пры ЦП саюзу саўгандальслужачых паведамляе ўсіх членаў саюзу СГС, што **заняткі фізкультурных гурткоў пачнуцца з 1 ліста пада ў спартыўнай залі клюбу.** Арганізаваны секцыі гімнастыкі, гульні, зімовых відаў спорту. Члены саюзу СГС, жадаючыя прыняць удзел у адной з секцый, могуць запісацца ў сваім месцы коме або ў канцылярыі клюбу з 8 да 9 гадз. увеч. штодзённа.

— ЦБ СНП паведамляе навуковых працаўнікоў гор. Менску, што рэгістрацыя навуковых працаўнікоў і іх сем'яў, жадаючых харчавацца ў сталоўцы, якая адкрываецца для навуковых працаўнікоў, будзе праводзіцца ў клюбе навуковых працаўнікоў ад 7 да 10 гадз. увеч. з 25 да 30/X.

— Штаб Усебеларускай Культэстафэты знаходзіцца пры НКА (пакой № 3, 2-гі паверх). Дзяжурствы пры штабе адбываюцца з 9 — 4 г. дня і з 6 — 10 г. увеч.

— Дом Пісьменьніка. А 7 гадз. увеч. адбудзецца пасяджэньне камісіі БелАПП'у па выпрацоўцы праграмы для літгурткоў. Павінны зьявіцца т.т. Аляхновіч, Бранштэйн, Бэндэ, Гальпэрына, Гародня і Мурашка.

— БАН. А 6 гадз. увеч., у памяшк. залі БАН (2-гі паверх) адбудзецца адкрытае пасяджэньне катэдры марксізму і ленінізму, на якім будзе заслухан даклад т. С. Я. Вальфсона на тэму: «Сучасная рэлігійнасьць у БССР» па матэрыялах даследваньня. Яўка членаў катэдры абавязкова. Запрашаюцца члены ЦС СВБ, члены брыгады бязбожнікаў пры клюбе вучоных і ўвесь актыў бязбожнікаў. Уваход вольны.

— БДУ. А 7 гадз. увеч., у 317 аўд. гал. корп. Універс. гарадка адбудзецца агульна-факультэцкі сход студ. Наргасу. Парадак дня: 1) Абгаварэньне наказу новаму складу прафкому. 2) Выбары прафкому і рэвізійн. камісіі. Яўка для студ. абавязкова. Запрош. навук і техн. працаўнікі ф-ту.

— БАН. А 12 з палов. гадз., у пак. 36 адбудзецца 1-е пасяджэньне семінару асьпірантаў пад кіраўніцтвам т. Рыўліна на тэму: «Асноўныя праблемы гісторыі ў асьвятленьні Леніна».

— А 2 гадз. дня, у пак. № 36 БАН адбудзецца аб'яднанае пасяджэньне асьпіранцкіх бюро БАН, БДУ і Камвузу.

— БДУ. А 5 гадз. дня, у гал. корп. (3-ці паверх, аўд. 302) адбудзецца адкрыты сход калектыву КП(б)Б падфаку. У парадку дня: 1) Справаздача бюро партколектыву падфаку. 2) Перавыбары бюро. Запрашаюцца рабочыя Універс. гарадка, студ. і навук. працаўнікі.

— Дом Асьветы. 26 кастрычніка, а 7 гадз. увеч., адкрыты сход партколектыву прапасьветы. У парадку дня даклад аб працы ячэйкі КП(б)Б БАН. Запрашаюцца асьветнікі.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

Аб скліканьні Ўсебеларускай нарады камітэтаў па паляпшэньні працы і быту работніц і сялянак.

10 лістапада гіг у гор. Менску склікаецца

ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА КАМІТЭТАЎ ПА ПАЛЯПШЭНЬНІ ПРАЦЫ І БЫТУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК.

ПАРАДАК ДНЯ НАСТУПНЫ:

1. Перавыбарчая кампанія саветаў. (Дакл. т. Хацкевіч).
2. Аб становішчы жаночай працы на вытворчасьці. (Даклад. т.т. Грысевіч і Рыжоў).
3. Аб удзеле жанчын у калгасным будаўніцтве. (Даклад. т. Міцькоў).
4. Аб мерапрыемствах па разгортваньні сеткі бытавых устаноў. (Дакл. т.т. Гольдберг, Лебедзева і Гурэвіч).

На нараду запрашаюцца:

а) старшыні або адказныя сакратары ўсіх раённых камітэтаў па палепшаньні працы і быту работніц і сялянак;
б) па адным прадстаўніку ад 4-х гарадзкіх бытавых сэкцый — Менскай, Гомельскай, Віцебскай і Бабруйскай;
в) па адным прадстаўніку ад 10 сельскіх сэкцый пры нацсаветах і па адпаведным прадстаўніку ад 20 буйнейшых прадпрыемстваў, па адным ад культ-бытавых камісій 15 буйнейшых калгасаў, згодна асобнага сьпісу, які будзе вызначаны дадатково.

КАМІТЭТ па паляпшэньні працы і быту работніц і сялянак пры Прэзыдыуме ЦВК БССР.

Сёньня, 25 кастрычніка, а 7 гадзіне вечара ў памяшканьні ДОМУ ПІСЬМЕНЬНІКА

адбудзецца

адкрыты агульны сход

калектыву КП(б)Б рэдакцый цэнтральных газэт і друкарні „Зьвязды" супольна з калектывам ЛКСМБ.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад тав. ВАСКАБОЙНІКАВА — «Як газэты БССР вядуць барацьбу за рэалізацыю адозвы ЦК УсеКП(б)»; суадклады сакратароў цэхавых партыйных ячэек: «Зьвязды», друкарні, «Рабочай», «Акцябр», «Савецкая Беларусь», «Чырвоная Зьмена» і камсамольскага калектыву аб выкананьні пастановы бюро парткалектыву аб мерапрыемствах цэхячэек у сувязі з адозвай ЦК УсеКП(б).
2. Аб арганізацыі вытворчых манэўраў у апаратах родакцый цэнтральных газэт.
3. Паведамленьне аб пастановах бюро партколектыву.

Яўка ўсіх членаў, кандыдатаў КП(б)Б, працуючых у родакцыях газэт і друкарні, абавязкова ў парадку партыйнай дысцыпліны, а таксама і камсамольцы.

Запрашаюцца беспартыйныя рабочыя друкарні, супрацоўнікі газэт і кантор, а таксама рабкоры менскіх прадпрыемстваў.

БЮРО КАЛЕКТЫВУ КП(б)Б.
БЮРО КАЛЕКТЫВУ ЛКСМБ.

Сёньня, 25 кастрычніка, а 6 г. увеч., у памяшк. Беларускага дзяржаўнага тэатру адбудзецца

ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае дачы старту Усебеларускай культэстафэты.

Уваход па запрашальных білетах.

ДОМ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

У надзелю, 26 кастрычніка, а 7 гадз. увеч. у Доме Чырвонай арміі ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ МОПР'у БЕЛАРУСІ

скліка е

агульна-гарадзкі сход чырвонаармейцаў, якія дэмабілізуюцца.

НА ПАРАДКУ ДНЯ:

1. Даклад аб задачах чырвонаармейцаў-мопраўцаў на нёсны (дакл. т. ПАНАЎ).

Пасьля сходу — К І Н О.

ЦК МОПР'у БССР.

Кастрычніцкі РК МОПР'у склікае на 27 кастрычніка, а 7 г. увеч., у памяшк. РК (вул. К. Маркса, 3)

мопраўскі актыў Кастрычніцкага раёну,

з наступным парадкам дня:

плян сьвяткаваньня мопраўцамі XIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі: перавыбарчая кампанія і раённая канфэрэнцыя.

Бюро яч. МОПР'у вырока спавяшчае мопраўскі актыў пра гэты сход.

Кастрычніцкі РК МОПР'у.

ЦП саюзу саўгандальслужачых

сумесна з партколектывам МЦРК

склікае на 27 КАСТРЫЧНІКА, а 8 г. увеч., у памяшк. клюбу „САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫ"

ЗЬЛЁТ УСІХ УДАРНІКАЎ МЦРК

Парадак дня: 1. Вынікі выкананьня гандальфінплану МЦРК за 29-30 г., кантрольныя лічбы на вобны квартал 30 г. і на 1931 г. (Дакл. Праўл. МЦРК). 2. Становішча ўдарніцтва па МЦРК і іх удзел у прапрацоўцы гандальфінплану (дакл. ЦП саюзу і рапарты ўдарных крам №№ 6, 63, 13, і 83. 3. Выбары дэлегатаў на ўсебеларускую канфэрэнцыю па сацпаборніцтве і ўдарніцтве па кооперацыі.

Яўка ўдарнікаў МЦРК абавязкова. Запрашаюцца ўдарнікі гандлёва-кааперацыйных устаноў, усе працаўнікі МЦРК і рабочыя-ударнікі.

БЕЛДЗЯРЖ-ВЫДАВЕЦТВА

Да XIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі

НА ДНЯХ ВЫХОДЗІЦЬ З ДРУКУ

В. СТАШЭЎСКІ. Гаворыць Асінстан імя СТАЛІНА.

Цана 50 кап. Стар. 80.

Кіно-тэатр „Культура"

Новы амэрыканскі фільм

БІЗУН НАГЛЯДЧЫКА

Зьвыш праграмы: кіно-хроніка Саюзкіно № 56.

ПАСЬЛЯ КОЖНАГА СЭАНСУ ВЯЛІКІ КАНЦЭРТ.

Пачат. дзенным сэансаў а 1 гадз. Каса—ад 12 гадз. дня. Пачат. вачэрніх сэансаў а 7 г. Каса—ад 5 гадз.

КІНО „Інтэрнацыянал"

Замежны фільм

У ДОКАХ НЬЮ-ЁРКУ (НОЧ на ЗЯМЛІ)

Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. увеч. Каса адкрыта ад 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары"

Новы фільм вытворчасьці „МЕЖРАБПОМ ФІЛЬМ"—Масква, „ПРОМЭТЭУС"—Бэрлін

„ЭЛЬ-ІЕМЕН"

сацыяльна-этнаграфічны нарыс у 6 частках.

Зьвыш праграмы: хроніка Саюзкіно № 37.

Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. Каса адкрыта ад 5 гадз.

Кіно „Юны піянэр"

2-ая сэрыя

Станлей у нетрах Афрыкі (АДЗІН СУПРОЦЬ МНОГІХ)

Пачатак 1-га сэансу а 12 г. дня. Каса адкрыта ад 11 гадз. раніцы.

Кіно „СПАРТАК"

выдатны фільм

НАМУС

трагедыя ў 8 част.

Сёньня 4 сэансы

Пач. сэансоў: 5 г. 30 м., 7 г. 15 м., 9 г., 10 г. 45 м.

Каса—ад 4 г. 30 м.

БЕЛАРУСКАЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ БУДАЎНІЧАЯ КАНТОРА

„БЕЛБУДКАНТОРА"

пры «БЕЛЖЫЛСАЮЗЕ»

прымае на сябе выкананьне розных будаўнічых работ (жыльлёвыя і інш.).

Зацікаўленым у гэтым будаўніцтве на 1931 г. належыць

ЗЬВЯРНУЦЦА ДА І СЬНЕЖНЯ г. г. У «БЕЛБУДКАНТОРУ».

Менск, Інтэрнацыянальная вул., № 12.

Пасьля гэтага тэрміну заўкі на 1931 г. прымацца ня будуць.

Пры Белбуканторы ёсьць ПРАЕКТНАЕ БЮРО, якое прымае на сябе падрыхтоўку ўсякіх праектаў, каштарысаў, тэхнічных разьлікаў і інш.

Мастацкі ЦЫРК

пр. І. Л. СТРАШЭВІЧА

СЁНЬНЯ

Субота, 25 кастрычніка

ПАЧ. а 8 з пал. гадз. увеч.

ВЯЛІКІ ВЕЧАР АРТЫСТЫХ ЦЫРКУ І ЭСТРАДЫ

з удзелам усёй трупы цырку і прыбыўшых арт. эстрады

Гастролі Маскоўскага мастацкага вакальнага квартэту імя САФОНАВА

Гімнасты Бр. Джыованні кольцы

К. Русэль мушторованых жывёл 20 20

Расійскі атракцыён 2 Раўш 2 перш.

Жывы факел Гр. Снор паветр. акт.

ТОЙ ХТО СВАЯЧАСОВА падпішацца на газэту „Зьвязда",

ТОЙ ГАРАНТУЕ СЕБЕ акуратную дастаўку газэты з 1-га ЛІСТАПАДА

Вячэрні сэктар Камуністычнага Універсытэту Беларусі імя У. І. Леніна абвяшчае, што з 1-га ЛІСТАПАДА 1930 г. ПРЫЁМ студэнтаў у Вячэрні Камвуз БУДЗЕ СПЫНЕН

ІНСТЫТУТУ ХЭМІІ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК ПАТРАБУЮЦЦА ХЭМІКІ-АНАЛІТЫКІ і ЛЯБАРАНТЫ.

Жадаючыя заняць павінны падаць заяву на імя Інстытуту і прыляжыць жыцьцяпіс.

В. аб. дырэктара Інстытуту хэміі БАН Варшун.

Згублена дамовая кніга д. 54 Сьвінаадкормачнай базы па Правіцкай вул. Лічыць несапраўднай.

Кошт публікацыі АБ ЗГУБЕ 1 дакументу 50 к.

МЯНЯЮ КВАТЭРУ з 2-х пакояў з усімі выгодамі ў центры гор. Віцебску на 1-2 пакоі ў Менску. Звяцца па хат. № 12-57 СОРКІНУ.

ПРАДАЮЦЦА шкляныя балёны з пад мінералы. Зварачацца: Савецкая, 63. Зот. гасп. выд—ва „ЗЬВЯЗДА"

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы

пічыць несапраўднымі

Кааперацыйная кніжка Кузьміцкага П. І., выд. Заслаўск спаж. таварыствам; кв. 2569; каап. кн. т-ва «Зямляроб» Афтусьціновіча І. М., кв. 2569; метр пасьведч. Мэзін В. І., выд. Мен. прыгар. с-с. кв. 2570; студ. біл. № 260, выд. Бел. с.-г. акад., вайск. біл., выд. Горакж. РВК на імя Сапановіча Д. Л., кв. 2571—2572; папш. Рыхтор А. В., выд. Мен. міліцыяй, кв. 2573; асабов. пасьведч. № 9-д, выд. Жлоб. к-рай цяті Зах. чыг., клюбны біл., выд. Жлоб. чыгуначн. клюбам на імя Дубаніка А. А., кв. 2574—2575; асаб. кн., выд. Самахвал. РВК, каап. кн., выд. т-вам «Зямляроб» на імя Яращэвіч Л. П., кв. 2576—2577; папш. Грэзоўскай Г. С., выд. Мен. міліцыяй, кв. 2578; вайск. пасьведч. Янкоўскага Г. І., выд. Мен. ваенкам., кв. 2579; папш. Ейдельмана Б. Ш., выд. Мен. міліцыяй, кв. 2580.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ" прымаюцца да 2 гадз. дня

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск

Менск. Галоўлітбел 337.